Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КРАСАВІК 21 1933 г. № 88 (4632)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

## Тэлеграма тав. Постышава

*Менск, ЦК КП(б)Б*

**Беларускім бальшавіком, камсамольцам, калгасьнікам-ударнікам, аказаўшым вялізарную дапамогу насеннай бульбай пралетарам і калгасьнікам Харкаўшчыны,—шлем бальшавіцкае прывітаньне і таварыскую падзяку. Будзем біцца за перамогу ў сяўбе.**

**Харкаўскі абком—ПОСТЫШАЎ.**

## ПОУНАСЬЦЮ І У ТЭРМІН ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ

Апублікаваная ў «Зьвязьдзе» пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб кантрактацыі ільну і канапель павінна прыкаваць да сябе ўвагу ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі. Кантрактацыя — адно з важнейшых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі і ўраду. Барацьба за поўнае і своячасовае выкананьне пляну кантрактацыі — неадлучная частка барацьбы за пасьпяховае правядзеньне сяўбы, за посьпех загатовак тэхнічных культур, за выкананьне народна-гаспадарчага пляну першага году другой пяцігодкі.

Нічым нельга апраўдаць тое становішча, якое мы маем зараз на вучастку кантрактацыі. Зьвернемся да лічбаў.

**По данных на 15 красавіка плян кантрактацыі па рэспубліцы выкананы: па ільнавалакну — на 52,2 проц., па ільнанасеньні — на 45,7 проц.** 15 раёнаў БССР — Асіпавіцкі, Жлобінскі, Камарынскі, Бялыніцкі, Чавускі, Клічаўскі, Чырвонапольскі, Лагойскі, Менскі, Пранойскі, Старобінскі, Тураўскі, Чачэрскі, Чэрвеньскі і Чэрыкаўскі — дагэтуль яшчэ і ня прыступілі да правядзеньня кантрактацыі. Па раду раёнаў, асабліва, замацаваных за сыстэмай Белкаапсаюзу, процант заключаных дагавораў зусім нязначны (Пухавіцкі — 1,7 проц., Быхаўскі — 2,4 проц., Глускі — 3,4 проц., Магілёўскі — 2,3 проц., Рагачоўскі — 3,4 проц., Віцебскі — 4,4 проц., Рэчыцкі — 5 проц., Пятрыкоўскі — 5,5 проц., Клімавіцкі — 6,7 проц. і г. д.).

«Прычыны такіх недапушчальна-марудных тэмпаў кантрактацыі трэба шукаць, па-першае, як правільна паказвае допіс у «Правде» ад 11 красавіка г. г. («Атмосфера чиновничьего равнодушия»), у непаваротлівасьці і адсутнасьці неабходнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку Белзагатлёў і БКС, па-другое, у апартуністычнай недаацэнцы цэлым радам раённых партыйных і савецкіх арганізацый кантрактацыі ільну, як важнейшай умовы барацьбы за выкананьне пасеўнага пляну па ільну, як важнейшай прадпасылкі ў барацьбе за стопроцантнае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай» (з паст. ЦК і СНК).

Пры аналізе зводкі аб ходзе кантрактацыі кідаецца ў вочы вялікая стракатасьць паказальнікаў выкананьня пляну па асобных раёнах. Гэта стракатасьць асабліва рэзка па групе ільнаводчых раёнаў. **Ільнаводчыя Полацкі, Дрысенскі, Горацкі і Сураскі раёны за два тыдні да тэрміну выканалі і перавыканалі пляны кантрактацыі.** Набліжаюцца да заваршэньня кампаніі **Шклоўскі** раён (88 проц.), **Мсьціслаўскі** (85,3 проц.), **Гарадоцкі** (84,9 проц.), **Лепельскі** (82,3 проц.) і інш.

А побач з гэтым, такія ільнаводчыя раёны, як **Бялыніцкі і Чавускі** па 15 красавіка не заключылі яшчэ ні аднаго кантрактацыйнага дагавору. А **Сіроцінскі і Бешанковіцкі** раёны выканалі пляны: першы на 10,4 проц., другі — на 20,5 проц.

У чым-жа справа? Ці ўмовы не аднолькавыя? Ці магчымасьці большыя ў таго ці іншага раёну? **Нічога падобнага!** Адны і тыя-ж умовы, адны і тыя-ж магчымасьці. **РОЗНАЯ** толькі работа раённых арганізацый, **неаднолькавы** толькі адносіны да кантрактацыйнай кампаніі ў розных раёнах. У адных раёнах партыйныя і савецкія арганізацыі зразумелі вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне кантрактацыі, узяліся за правядзеньне яе па-бальшавіцку, у другіх яе недаацэньваюць. У адных раёнах вакол кантрактацыі ўзьнят увесь партыйны і савецкі актыў, мабілізован загатоўчы апарат, у другіх на кантрактацыю глядзяць, як на другарадную задачу і не аддаюць ёй ніякай увагі.

У гэтым уся справа. Іменна ў людзях, іменна ў якасьці работы раённых кіруючых і загатоўчых арганізацый! Полацкі, Дрысенскі, Горацкі і Сураскі раёны паказалі ўзор сапраўды баявых тэмпаў работы, узор бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду. **І зусім заслужана гэтыя раёны, па ўказаньні ЦК і СНК прэміяваны Белканторай Загатлён грашыма, збожжам і прамтаварамі.**

Клясавы вораг аказвае актыўнае супраціўленьне кантрактацыйнай кампаніі. Кулак і яго агентура вядуць шалёную агітацыю сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў супроць заключэньня кантрактацыйных дагавораў, супроць здачы таварнай прадукцыі дзяржаве. Гэта агітацыя робіць асаблівы ўплыў там, дзе не вядзецца масавай работы. У вёсцы **Стан** Гарадоцкага раёну, з-за адсутнасьці масавай работы, кулацка-заможным элемэнтам удалося сарваць сход, прысьвечаны кантрактацыі. Такія факты мелі месца і ў іншых раёнах.

Задача ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый — павесьці **бязьлітасную барацьбу з кулацкім сабатажам, даць зьнішчальны адпор клясаваму ворагу, які імкнецца сарваць кантрактацыю тэхнічных культур.**

Галоўны ўпор трэба зрабіць на разгортваньні масава-палітычнай работы ў сельсаветах, калгасах, вёсках. Трэба мабілізаваць калгасны актыў, шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў па барацьбу за поўнае і своячасовае выкананьне пляну кантрактацыі, на першачарговую рэалізацыю абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай. Усе РК і РВК ільнаводчых раёнаў павінны вылучыць спэцыяльных упаўнаважаных па сельсаветах, адказных за кантрактацыю ільну, вылучыць на гэту работу найбольш кваліфікаваных работнікаў.

Кантрактацыю ні ў якім разе нельга разглядаць, як другарадную кампанію, якая ня мае ніякага дачыненьня да сяўбы. Наадварот, трэба памятаць, што поўнае і своячасовае выкананьне пляну кантрактацыі — важнейшая ўмова барацьбы за пасьпяховае правядзеньне сяўбы ільну. Таму ЦК і СНК абавязалі сваіх упаўнаважаных па пасеўнай кампаніі «актыўна ўключыцца ў справу кантрактацыі ільну. У ільнаводных раёнах на бліжэйшую пяцідзьнёўку справу кантрактацыі ільну лічыць асноўнай задачай упаўнаважаных ЦК і СНК».

Якасьць кантрактацыі павінна быць у цэнтры ўвагі. Зусім недапушчальны факты, якія мелі месца ў Лёзьнянскім, Дубровенскім, Пухавіцкім і іншых раёнах, дзе кантрактуючыя арганізацыі падыходзілі да гэтай работы фармальна-бюракратычна, зусім не зважаючы на ўказаньні ЦК і СНК аб тым, што «асноўным рашаючым зьвяном у справе ўзьнімацыі ўраджайнасьці, узмацненьня сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны, палітычнага і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца пастаянная вытворчая брыгада».

### Па Шклоўскім раёне

У радзе калгасаў маюць месца грубейшыя памылкі і скрыўленьні дырэктыў па арганізацыі брыгад і складаньні вытворчых пляноў. Пры складаньні вытворчых пляноў запраектаваны зусім ніізкая ўраджайнасьць. Напрыклад, у перагародным калгасе «Пражэктор» запраектавана ўраджайнасьць па ільнавалакну 1,2 центнэра з га, па жыту —6 цэнт. з га; у калгасе «Воля» па ільнавалакну—1,1 центнэра з га; у калгасе «Новыя Сьлёзы»: ільнавалакна—1,3 цэнт., аўса—4 цэнт., пшаніцы—4 цэнт. з га.

Замест устаноўленых урадам скарочаных тэрмінаў правядзеньня веснавой сяўбы, у паасобных калгасах па вытворчым плянe памячаюцца надзвычай расьцягнутыя тэрміны, як, напрыклад, на калгасу «Ўраджай» тэрмін скончэньня сяўбы намечан 10 чэрвеня гэтага году.

У вытворчых пляках ва многіх калгасах не намечаны атратэхнічныя мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці і не прадугледжаны мерапрыемствы па правядзеньні першапачатковай апрацоўкі ільну.

Зусім недастаткова разгорнута масавая работа вакол гэтых пастановаў ЦК і СНК, не мабілізаваны шырокія калгасныя масы на іх выкананьне.

У выніку гэтага ня выкананы пастановы ЦК і СНК аб скончэньні работы па складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі пастаянных брыгад да 25 сакавіка 1933 году.

Поўная адсутнасьць кіраўніцтва з боку РК, РВК, МТС работай па складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад у калгасах. Партыйныя і савецкія раённыя арганізацыі зусім ня ведаюць, як праходзіць гэта работа ў калгасах.

### Па Шклоўскім раёне

У радзе калгасаў маюць месца грубейшыя памылкі і скрыўленьні дырэктыў па арганізацыі брыгад і складаньні вытворчых пляноў. Пры складаньні вытворчых пляноў запраектавана зусім ніізкая ўраджайнасьць. Напрыклад, у перагародным калгасе «Пражэктор» запраектавана ўраджайнасьць па ільнавалакну 1,2 центнэра з га, па жыту —6 цэнт. з га; у калгасе «Воля» па ільнавалакну—1,1 центнэра з га; у калгасе «Новыя Сьлёзы»: ільнавалакна—1,3 цэнт., аўса—4 цэнт., пшаніцы—4 цэнт. з га.

Замест устаноўленых урадам скарочаных тэрмінаў правядзеньня веснавой сяўбы, у паасобных калгасах па вытворчым плянe памячаюцца надзвычай расьцягнутыя тэрміны, як, напрыклад, на калгасу «Ўраджай» тэрмін скончэньня сяўбы намечан 10 чэрвеня гэтага году.

У вытворчых пляках ва многіх калгасах не намечаны атратэхнічныя мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці і не прадугледжаны мерапрыемствы па правядзеньні першапачатковай апрацоўкі ільну.

### Па Менскім раёне

Складзеныя калгасамі і прысланыя ў гарэ 29 вытворчых пляноў не праверваны і не зацьверджаны.

Атрыманыя гарэ 26 сакавіка т. т. брашуры з прыкладнымі нормамі выпрацоўкі да 5 красавіка гэтага году ня былі разасланы па ўсіх калгасах. У радзе калгасаў у вытворчых пляках запраектавана наніжаная супроць кантрольных заданьняў ўраджайнасьць (калгасы «Чырвоны спэцыяліст», «Чырвоны ўдарнік») і расьцягнутыя тэрміны сяўбы да 27-33 дзён (калгасы імя Фалько, «Дружба», «Ударнік» і інш.).

Першая МТС (дырэктар — [illegible]) не апрацавала пасланыя калгасамі вытворчыя пляны, у якіх дапушчаны грубейшыя скажэньні ў выглядзе наніжанай ўраджайнасьці і расьцягнутых тэрмінаў сяўбы.

У калгасе «Ударнік», Каладзішчанскага сельсавету, арганізаваны дробныя брыгады па 11-18 чал.

### Па Аршанскім раёне

РК, РВК, райза і МТС работай па складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад ня кіруюць. Спэцыяльны інструктаж старшынь і рахункаводаў калгасаў па гэтых пытаньнях не праводзіўся.

Ня гледзячы на тое, што ў раёне па розных установах ёсьць усяго 45 агранамаў, на 27 сакавіка з 270 калгасаў вытворчыя пляны былі складзены толькі ў 32-х.

Па данных райзы, у 4-х сельсаветах вытворчыя пляны лічыліся складзенымі ва ўсіх калгасах, а пры праверцы выявілася, што ні ў адным з калгасаў гэтых сельсаветаў пляны ня складзены. Мабілізаваньня (21 сакавіка гэтага году работнікі для дапамогі калгасам у складаньні вытворчых пляноў да 29 сакавіка не выклікалі ў калгасы. Шэфскія арганізацыі ніякай дапамогі калгасам у правядзеньні гэтай работы не аказалі (аршанскі ільназавод, вышэйшая калгасная школа).

У радзе калгасаў вытворчыя брыгады арганізаваны механічна, без давядзеньня вытворчых заданьняў; нормы выпрацоўкі на 1933 год не прапрацаваны, або вельмі зьніжаны супроць прыкладных норм Наркамзему, як напрыклад: ворыва на лёгкай глебе—0,4 га, баранаваньне «Зіг-Заг» у два сьляды — 2 га (калгас «Чырвоны ўсход», «На варце», «Ленінскія ўсходы»).

## Аб ходзе складаньня вытворчых пляноў і вытворчых брыгад па Шклоўскім, Менскім, Аршанскім і Талачынскім раёнах

*Пастанова ЦК КП(б)Б*

Праверка выкананьня пастановы ЦК і СНК аб складаньні вытворчых пляноў і калгасах і вытворчых брыгадах па Шклоўскім, Менскім, Аршанскім і Талачынскім раёнах паказала, што РК, РВК, райза, МТС, сельпартарганізацыі і сельсаветы гэтых раёнаў недаацанілі важнейшага значэньня гэтых мерапрыемстваў у справе падрыхтоўкі і пасьпяховага правядзеньня веснавой пасеўкампаніі і непыстарчальна зразумелі ўказаньні ЦК і СНК аб тым, што «асноўным рашаючым зьвяном у справе ўзьнімацыі ўраджайнасьці, узмацненьня сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны, палітычнага і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца пастаянная вытворчая брыгада».

### Па Шклоўскім раёне

У радзе калгасаў маюць месца грубейшыя памылкі і скрыўленьні дырэктыў па арганізацыі брыгад і складаньні вытворчых пляноў. Пры складаньні вытворчых пляноў запраектавана зусім ніізкая ўраджайнасьць. Напрыклад, у перагародным калгасе «Пражэктор» запраектавана ўраджайнасьць па ільнавалакну 1,2 центнэра з га, па жыту —6 цэнт. з га; у калгасе «Воля» па ільнавалакну—1,1 центнэра з га; у калгасе «Новыя Сьлёзы»: ільнавалакна—1,3 цэнт., аўса—4 цэнт., пшаніцы—4 цэнт. з га.

Замест устаноўленых урадам скарочаных тэрмінаў правядзеньня веснавой сяўбы, у паасобных калгасах па вытворчым плянe памячаюцца надзвычай расьцягнутыя тэрміны, як, напрыклад, на калгасу «Ўраджай» тэрмін скончэньня сяўбы намечан 10 чэрвеня гэтага году.

У вытворчых пляках ва многіх калгасах не намечаны атратэхнічныя мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці і не прадугледжаны мерапрыемствы па правядзеньні першапачатковай апрацоўкі ільну.

### Па Менскім раёне

Складзеныя калгасамі і прысланыя ў гарэ 29 вытворчых пляноў не праверваны і не зацьверджаны.

Атрыманыя гарэ 26 сакавіка т. т. брашуры з прыкладнымі нормамі выпрацоўкі да 5 красавіка гэтага году ня былі разасланы па ўсіх калгасах. У радзе калгасаў у вытворчых пляках запраектавана наніжаная супроць кантрольных заданьняў ўраджайнасьць (калгасы «Чырвоны спэцыяліст», «Чырвоны ўдарнік») і расьцягнутыя тэрміны сяўбы.

У калгасе «Ударнік», Каладзішчанскага сельсавету, арганізаваны дробныя брыгады па 11-18 чал.

### Па Аршанскім раёне

РК, РВК, райза і МТС работай па складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад ня кіруюць. Спэцыяльны інструктаж старшынь і рахункаводаў калгасаў па гэтых пытаньнях не праводзіўся.

Ня гледзячы на тое, што ў раёне па розных установах ёсьць усяго 45 агранамаў, на 27 сакавіка з 270 калгасаў вытворчыя пляны былі складзены толькі ў 32-х.

Па данных райзы, у 4-х сельсаветах вытворчыя пляны лічыліся складзенымі ва ўсіх калгасах, а пры праверцы выявілася, што ні ў адным з калгасаў гэтых сельсаветаў пляны ня складзены. Мабілізаваньня (21 сакавіка гэтага году работнікі для дапамогі калгасам у складаньні вытворчых пляноў да 29 сакавіка не выклікалі ў калгасы. Шэфскія арганізацыі ніякай дапамогі калгасам у правядзеньні гэтай работы не аказалі (аршанскі ільназавод, вышэйшая калгасная школа).

У радзе калгасаў вытворчыя брыгады арганізаваны механічна, без давядзеньня вытворчых заданьняў; нормы выпрацоўкі на 1933 год не прапрацаваны, або вельмі зьніжаны супроць прыкладных норм Наркамзему, як напрыклад: ворыва на лёгкай глебе—0,4 га, баранаваньне «Зіг-Заг» у два сьляды — 2 га (калгас «Чырвоны ўсход», «На варце», «Ленінскія ўсходы»).

### Па Талачынскім раёне

Райза і МТС ня ведаюць, колькі складзена вытворчых пляноў па калгасах раёну.

Ні адзін з прысланых у райза і МТС вытворчых пляноў, складзеных калгасамі, райза і МТС не зацьверджан. У калгасе «Голашава» па вытворчым пляне зьменшана вытворчае заданьне па разьвіцьці рабочай жывёлы, замест устаноўленага раённага заданьня па пагалоўі коняй на канец году ў колькасьці 28 галоў, дадаткова намечана 16 галоў.

Ёсьць факты арганізацыі надзвычай грамоздкіх брыгад, зьвыш 80 чалавек (калгас «Кастрычнік»).

Ні ў адным з 7 абследаваных калгасаў не вызначаны брыгадам коні, збруя і інвентар, не замацаваны за асобнымі калгасьнікамі ўнутры брыгад.

***

ЦК указвае РК і РВК, райза і МТС Шклоўскага, Менскага, Аршанскага, Талачынскага раёнаў на іх бязьдзейнасьць у справе арганізацыі і кіраўніцтва пытаньнямі ўнутрыкалгаснага планаваньня, арганізацыі працы ў калгасе, а таксама на адсутнасьць заваротнай сувязі кіраўніцтва калгасным пляновым гаспадаркам з калгаснікамі ўпадбу.

ЦК канстатуе, што ў радзе месц не зрозумелі ўказаньня тав. Сталіна, дадзенага ім у сваёй грамове на пленуме ЦК і ЦКК УсесКП(б) «Аб рабоце на вёсцы», аб тым, што «перагіны ўжо ня можа зараз абмеркавацца паасобнымі актамі ўмешваньня ў працэсы сельска-гаспадарчага разьвіцьця. Яна павінна зараз усюды у свае рукі кіраўніцтва калгасамі, прыняць на сябе адказнасьць за работу і дапомогу калгасьнікам, весьці свае гаспадарку ўперад на падставе даных навукі і тэхнікі».

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць Наркамзему БССР, Шклоўскаму, Менскаму, Аршанскаму і Талачынскаму РК КП(б)Б скасаваць няправільна складзеныя ў вышэйпералічаных калгасах вытворчыя пляны і арганізаваныя няправільна брыгады, выправіўшы іх у адпаведнасьці з дырэктывамі ЦК і СНК, а таксама нарадзьці спадзяцьцо на тых работнікаў, якія скрыўленьні.

2. За адсутнасьць кіраўніцтва і да пушчаньне грубейшых скрыўленьняў дырэктыў ЦК і СНК пра арганізацыю брыгад і складаньне вытворчых пляноў,—перадаць справу ў ЦКК аб партыйнасьці зьнятага з работы дырэктара Шклоўскай МТС т. Зелянкоўскага. Паставіць на від за бязьдзейнасьць сакратару Шклоўскага РК КП(б)Б т. Кіштымаву і старшыні РКК т. Мянчонак. Абвясьціць вымову загадчыку Шклоўскага райза т. Буйвалаву. За адсутнасьць кіраўніцтва работай па складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад, нескарыстаньне наяўных у раёне агранамаў для дапамогі калгасам у гэтых пытаньнях,—паставіць на від сакратару Аршанскага РК КП(б)Б т. Чарныпову і старшыні РВК т. Валасевічу, а заг. Аршанскага райза т. Жылінка, які сыстэматычна зрываў справу кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам,—з работы зьняць.

3. За поўную адсутнасьць кіраўніцтва работай па складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі пастаянных брыгад у калгасах, за дапушчаньне скажэньняў дырэктыў ЦК і СНК па гэтых пытаньнях, невыкананьне ў тэрмін дырэктыў ЦК і СНК, ня гледзячы на поўную магчымасьць своячасовага і поўнага іх выкананьня, пры наяўнасьці навуковых устаноў і вялікай колькасьці мабілізаваных спэцыялістаў,—заг. Менскага гарэ т. Якубовічу абвясьціць суровую вымову і папярэдзіць, што калі ён у бліжэйшую дэкаду не дабіцца рашучага пералому ў рабоце, да яго будуць ужыты больш суровыя меры партспагнаньня.

Дырэктару 1-й Менскай МТС т. Шэлёгу за адсутнасьць кіраўніцтва складаньнем вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад і механічнае пытаньне складзеных калгасамі вытворчых пляноў—абвясьціць суровую вымову.

4. Прызнаючы зусім нездавальняючым становішча са складаньнем вытворчых пляноў і арганізацыяй брыгад у большасьці раёнаў БССР,—прапанаваць Наркамзему, усім РК, РВК, МТС, сельпартячэйкам і сельсаветам пасьпяхова разгарнуць работу па складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад у калгасах так, каб скончыць гэту работу да 20 красавіка.

Мабілізаваць для дапамогі калгасам ва ўвядзеньні веснавой сяўбы, складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад ня менш 150 спэцыялістаў з цэнтральных устаноў і навукова-дасьледчых інстытутаў.

Адзначыць абсалютна нездавальняючую работу Наркамзему і трактарапрыпраў па кіраўніцтве работай МТС у справе складаньня калгасных вытворчых пляноў. Прапанаваць т. т. Залескаму, Пушчыну, Трэбенчыну, Дубоўскаму паклясьці штодзённае апэратыўнае кіраўніцтва гэтым важнейшым вучасткам падрыхтоўкі да пасеўнай.

5. Усім РК і РВК неадкладна пераключыць усіх спэцыялістаў раённых устаноў на работу на ўвядзеньні веснавой сяўбы, складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад. РК КП(б)Б неадкладна ўзяць гэту работу пад свой непасрэдны нагляд, вылучыўшы і замацаваўшы за трыгадамі калгасаў спэцыяльных упаўнаважаных для гэтага партыйнага актыву.

6. Абавязаць рэдакцыі газэт «Зьвязда», «Калгасьнік Беларусі» зьмясьціць у бліжэйшыя дні разгорнутую крытыку дапушчаных калгасамі памылак у складаньні вытворчых пляноў і арганізацыі брыгад, а таксама паказаньне лепшых прыкладаў правільнай арганізацыі вытворчых брыгад і складаньня вытворчых пляноў у калгасах.

7. ЦК прапануе ўсім РК, РВК, райза, МТС, старшыням сельсаветаў і калгасаў улічыць памылкі і недахопы абсьледаваных раёнаў, дабіваючыся таго, каб да пачатку сяўбы кожны калгас быў-бы ўзброены вытворчым пляном, прапрацаваным пры ўдзеле ўсіх калгасьнікаў, вытворчым пляном, прадугледжваючым павышэньне ўраджайнасьці. Каб да пачатку сяўбы кожны калгас, дзе павінны быць арганізаваны брыгады, меў вытворчыя брыгады з цьвёрда замацаванымі вучасткамі, інвентаром, цягавай сілай, з выразнай расстаноўкай сіл у брыгадах, памятаючы, што калгасны плян і правільна арганізаваны брыгады—гэта рашаючыя і важнейшыя ўмовы пасьпяховага правядзеньня сяўбы і павышэньня ўраджайнасьці.

## ПАСЬЛЯ ПРЫГАВОРУ

**Кожны, хто бесстаронна сачыў за ходам працэсу, павінен прызнаць, што прыгавор угрунтован на дэтальным узважваньні ступені віны кожнага з падсудных, як і ўсёй абстаноўкі ў краіне. Пераможнае завяршэньне пяцігодкі, ліквідацыя галоўных ачагоў шкодніцтва, узросшая пільнасьць народных мас—усе гэтыя акалічнасьці даказваюць, што мы маем усе падставы весьці не палітыку запалохваньня, а палітыку справядлівага пакараньня за віну. Савецкае правасудзьдзе і ў далейшым будзе стаяць на варце інтарэсаў дзяржавы, супроць злачынных, нарысьлівых і лёгкадумных элемэнтаў.**

**Міжнароднае значэньне працэсу выклікана тым, што шкоднікі былі зьвязаны з групай чужаземных шпіёнаў. Шпіёнаж зьяўляецца нямінучым спадарожнікам імпэрыялісцкай падрыхтоўкі вайны нападу і імпэрыялісцкіх падрыхтаваньняў супроць Савецкага саюзу ў прыватнасьці. У даным выпадку гэты шпіёнаж выбраў сабе шырмай буйную чужаземную фірму, якая працавала ў нас на аснове дагавору з савецкімі гаспадарчымі ўстановамі. Але замест таго, каб рабоча адмежавацца ад людзей, якія пад назвай інжынэраў, эпоўжываючы аказаным ім давер'ем, вялі шпіёнскую і шкодніцкую работу, разбэшчвалі савецкіх дзяржаўных служачых і такім чынам падрывалі давер'е, аказанае чужаземным фірмам. Значная частка ангельскай буржуазіі, увесь ангельскі імпэрыялісцкі друк сталі самым рашучым чынам на абарону абвінавачаных.**

**Той факт, што адказныя колы ангельскага імпэрыялізму выступілі адразу з заявамі аб невінаватасьці людзей, ня ведаючы нават, у чым яны абвінавачваюцца, ужо з самага пачатку прымусіў шукаць прычын такога выступленьня зусім ня ў справе аб шкодніцтве і шпіёнстве пэўных асоб. Ярасны націск на савецкі ўрад з мэтай прымусіць яго адмовіцца ад расьсьледваньня справы, адмовіцца ад суда, паказаў, што прычыны гэтай барацьбы трэба шукаць у палітычных мэтах, якія прасьледваліся ангельскім імпэрыялізмам у адносінах да Савецкага саюзу на данай стадыі. Ангельскі міністар замежных спраў сэр Джон Саймон патрабаваў ад парляманту паўнамоцтваў на разрыў гандлёвых адносін, матывуючы сваё патрабаваньне тым, што такая пагроза зьяўляецца адзіным сродкам ціску ў руках ангельскага ўраду для абароны арыштаваных ангельцаў. Але ў канцы сваёй прамовы ад 5 красавіка ангельскі міністар замежных спраў раптам сказаў: «Сёньня, як і заўсёды, я за гандлёвы дагавор на справядлівых падставах. Але дзе рэальныя затрудненьні? Яны заключаюцца ў тым, што на аснове канстытуцыі Савецкага саюзу, на аснове факту, што рускі ўрад зьяўляецца адзіным пакупцом і адзіным прадаўцом, прымяненьне ў гандлёвым дагаворы прынцыпу найбольшага спрыяньня**

**Што гэта азначае? Хіба каб у СССР не існавала манаполія замежнага гандлю, што давала-б ангельскаму ўраду магчымасьць патрабаваць найбольшага спрыяньня для шпіёнаў? У сэра Джона Саймона выскачыла шыла з мяшка. Ангельскі ўрад абавязаўся ў Оттаве дапамагаць Канадзе за кошт Савецкага саюзу, каб утрымаць гэты да мінёўн ад больш блізкіх адносін са Злучанымі Штатамі. Оттаўскія рашэньні невыстарчальны для гэтай мэты. Трэба было атрымаць паўнамоцтвы біць па савецкім імпарце ў Англію ў карысьць каленіяльнага імпарту. Таму ангельскі ўрад скарыстаў правал ангельскіх разьведчыкаў, каб падняць ня бывалую кампанію супроць Савецкага саюзу і атрымаць надзвычайныя паўнамоцтвы быццам для выратаваньня ангельскіх грамадзян.**

**Хто меў якое-небудзь сумненьне наконт характару кампаніі, якая праводзіцца ў апошнія тыдні ў Англіі, таго павінна пераканаць рашэньне ангельскага ўраду ўвесьці ў жыцьцё праз тыдзень закон аб забароне ўвозу ў Англію 9-ці галоўных прадметаў савецкага імпарту ў гэту краіну. Дзе і хто ў сьвеце чуў, каб якая-небудзь краіна абвяшчала эканамічны байкот другой краіне, нават калі-б гэта другая краіна і вынесла несправядлівы прыгавор некалькім грамадзянам першай? Нам няма чаго тут даказваць, што прыгавор, вынесен спэцыяльным прысуцтвам Вярхоўнага суда, справядлівы. Так яго ацэньваюць кіруючыя органы амэрыканскага друку, так яго ацэньвалі прадстаўнікі прэсы цэлага раду другіх краін, якія прысутнічалі на працэсе. Хіба эканамічны байкот, хоць-бы часовы, зьяўляецца сродкам для таго, каб даказаць несправядлівасьць прыгавору? Гэта рашэньне ангельскага ўраду даказвае толькі, што паводзіны ангельскіх імпэрыялісцкіх колаў тлумачацца галоўным чынам ня ходам і вынікам працэсу і ня клопатамі аб асуджаных, а імкненьнем выкарыстаць імі-ж раздуты канфлікт з СССР у мэтах правядзеньня оттаўскай праграмы.**

**Ангельскаму імпэрыялізму не ўдалося ніякімі пагрозамі прымусіць савецкі ўрад адмовіцца ад суда, які даказаў віннасьць ангельскіх інжынэраў, як суўдзельнікаў шкоднікаў-савецкіх грамадзян і як людзей, якія займаліся шпіёнажам. Ангельскі ўрад вынушан быў для прыкрыцьця сваёй палітыкі нанясеньня страты гандлю з СССР ашукаць ангельскую грамадзкую думку, прадстаўляючы працэс і прыгавор у сьвятле, які ня мае нічога агульнага з сапраўднасьцю. Але працэс у Вярхоўным судзе—не зачыненыя наглухо дакі ўстаноў, дзе можна было змэйстравать «піст Зіноўева». На гэтым судзе прысутнічалі 50 чужаземных журналістаў і стэнаграма гэтага працэсу зьявіцца на ангельскай мове.**

**Утаіць праўду ад ангельскай грамадзкай думкі ня ўдасца тымі «мэтадамі», якія зараз ужываюцца ангельскім урадам.**

**Сапраўдная мэта ўсёй антысавецкай кампаніі, якая закончылася забаронай увозу савецкіх тавараў у Англію, будзе выкрыта канчаткова.**

**Мы пераконаны, што падобныя «мэтады» выпраўленьня гандлёвых дагавораў абернуцца супроць ураду, які імі карыстаецца.**

**(ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ «ИЗВЕСТИЙ», ПЕРАДАНЫ ПА РАДЫЁ).**

# АГРЭХ—ВОРАГ КАЛГАСНЫХ УРАДЖАЯУ

## МАЦНЕЙ УДАР ПА КУЛАЦКІХ СПРОБАХ ПАДАРВАЦЬ ДАХОДЫ КАЛГАСАУ ДРЭННАЙ АПРАЦОУКАЙ ГЛЕБЫ І ЗЬМЯНШЭНЬНЕМ НОРМ ВЫСЕВУ

## А СЕЛЬСАВЕТЫ... СЬВЯТКАВАЛІ

РЭЧЫЦА, 19. (Наш кар.).

Раён павінен засеяць да 25 красавіка 6.400 гэктар. пад авёс.

Паводле апошніх даных райземаддзелу калгасы засеялі толькі 111 га, аднаасобнікі — 32. Апроч таго, па калгасах засеяна 128 га ячменю, 85 — пшаніцы, 35 — яравога жыта і 3 га ільну. Аднаасобнікі засеялі 105 га ячменю, 88 га ярыны, 4 га ільну і 52 га пшаніцы.

У радзе сельсаветаў, напрыклад, у Караваціцкім пад авёс яшчэ не засеяні ні адзін гэктар.

Стаўка на самацёк, апартуністычнае самазаспакаеньне — вось у чым карэні такіх злачынных тэмпаў работы. Чаго варт хоць-бы той ганебны факт, што амаль усе сельсаветы ў раёне ў дні вялікадня не працавалі.

Вось, напрыклад, Горвальскі сельсавет. Паасобныя калгасы ў полі — за ворывам і сяўбой. Калгас «Чырвоны Кастрычнік» узараў 14 і засеяў 7 га аўса, калгас «Ударнік» узараў 12 га і г. д.

А работнікі сельсавету? Што яны робяць? Як яны змагаюцца за паскарэньне палявых работ, як кіруюць ворывам і сяўбой? Яны ў гэты час сьвяткуюць.

У раёне па гэтым абураючым фактам... **махнулі рукой!**

## ПРАСТОІ, ПРАГУЛЫ, ПАЛОМКІ...

МАЗЫР, 19. (Наш кар.).

Масавая сяўба разгортваецца зусім марудна. На 15 красавіка раённы плян сяўбы яравых выканан толькі ў размеры 2,58 проц. Пад ранняя яравыя культуры засеяна 1.056.56 га. Саўгасы засеялі 30 гэктараў, калгасы — 803,18, прыгарадныя гаспадаркі — 18,48 і аднаасобнікі — 204,9 га.

Злачынна зацягвае палявыя работы Даманавіцкая машына-трактарная станцыя. Прастоі, паломкі, перавыдатак гаручага пры штодзённым невыкананьні норм ворыва — звычайнае зьявішча.

Трактарны парк — у паспраўнасьці. Машыны адрамантаваны настолькі дрэнна, што, не пасьпеўшы выйсьці ў поле, адразу спыняюць працу.

3-га красавіка ў калгас «Сейбіт», Мартынаўскага сельсавету была накіравана трактарная калёна з чатырох машын. Два трактары адразу сапсаваліся і сталі, як толькі прыбылі ў калгас. Сем раз выклікалі мэханіка МТС для таго, каб адрамантаваць гэтыя трактары. Аднак, ён зьявіўся толькі праз... 10 дзён. Прыехаў, прабыў у калгасе тры дні і... вярнуўся назад у МТС, нічога не зрабіўшы.

А як працуюць іншыя два трактары? Яны ня столькі ў полі на ворыве, колькі стаяць бяз усякай нагрузкі. За час з 3 па 16 красавіка гэтыя трактары прастаялі цэлых 5 дзён!

Прадукцыйнасьць працы ганебна ніізкая. За 8 дзён трэба было ўзараць мінімум 96 га. Узаралі-ж толькі 26,6.

У калгасе «Авангард» трактарная калёна з 5 машын узарала за 6 дзён усяго... 5 гэктараў!

Яшчэ і зараз не праверан склад трактарыстаў. Дырэкцыя МТС мяне за ўсё ведае, каму яна давярае руль.

На факты яўнага шкодніцтва ніхто не рэагуе. У калгасе «Першы май» у падпыпнікі аднаго трактара засыпалі пясок. Трактар адразу папсаваўся. Шкоднікі ня выкрыты і не пакараны.

Працоўная дысцыпліна сярод трактарыстаў расхістана. Пайдзеце ў калгас «Авангард», дзе працуе трактарная калёна № 1. На палёх стаяць бяз усякай работы адзінокія пакінутыя трактары. Дзе-ж трактарысты? Чаму яны спынілі ворыва і пакінулі ў полі машыны? Трактарыстам, аказваецца, захацелася пагуляць і яны пайшлі ў суседнія калгасы...

Дырэкцыя і агранамы МТС амаль ніколі ня бываюць па палёх. Ніхто з іх нічога ня ведае, як працуюць трактарныя калёны.

Вучастковы агранам Навадворскі, напрыклад, ня толькі ня мае ніякага ўяўленьня аб рабоце свайго вучастку, але нават ня ведае пра... нормы выпрацоўкі на адзін трактар.

Вытворчыя пляны і заданьні да трактарыстаў не давед

# СПРАВА АБ ШКОДНІЦТВЕ НА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯХ СССР

## ПРАМОВА ДЗЯРЖАЎНАГА АБВІНАВАЎЦЫ ПРАКУРОРА РЭСПУБЛІКІ ТАВ. ВЫШЫНСКАГА*)

### I. ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ПРАЦЭСУ

Магчыма якія-небудзь суткі аддаляюць нас ад таго рашучага моманту, калі будуць падведзены канчатковыя вынікі ўсёй нашай работы гэтых дзён, калі ў гэтых выніках будзе сказана аўтарытэтнае слова Вярхоўнага суда па гэтай справе. Нас аддаляе ня многа часу ад таго моманту, калі з усёй выразнасьцю, дакладнасьцю, яснасьцю, пэўнасьцю і катэгарычнасьцю будзе да нас апошні раз у гэтай справе кваліфікацыя і ўсіх тых асобных падзей, якія былі прадметам разгляду ўсяго нашага судовага следзтва, а перад тым папярэдняга расьсьледваньня, і ўсёй сумы тых грамадзкіх і палітычных фактаў, якія ляжаць у аснове гэтага працэсу.

Гэтыя вынікі павінны быць і будуць вельмі значнымі, бо гэта справа нават сярод іншых спраў, якія праходзілі перад Вярхоўным судом у ранейшыя гады, мае выключнае значэньне, бо гэта справа нават сярод іншых спраў, якія былі прадметам разгляду спэцыяльнага прысудзтва Вярхоўнага суда за апошнія гады, характарызуецца, як справа, маючая выключнае сусьветнае значэньне, як справа, да якой зараз прыкавана ўвага ўсяго сьвету, прапоўных нашай краіны, працоўных усіх краін, усіх нашых прыцяляў і усіх нашых ворагаў.

Усіх тых ворагаў, якія, асьлепленыя сваёй клясавай нянавісьцю, ахопленыя сваім пачуцьцём клясавай варожасьці і злобы, напярэдадні гэтага працэсу забылі граніцы, пастаўленыя ім суверэннасьцю нашай дзяржавы, забылі межы дазволенага ў міжнародных адносінах і зрабілі спробы зрабіць на ўвесь год гэтага працэсу, гэтай справы такі маральны пашіск, які сьведчыць аб тым, што часта антысавецкія колы, якія б'юцца ў гістэрыцы, трацяць неабходны і шырока ўзнаважаны спакой, пераступаюць межы дазволенага і вядома атрымліваюць патрэбны і заслужаны адпор.

Я не сумняваюся ў тым, што і надалей яны будуць атрымліваць такі-ж рашучы адпор, які прымусіць іх зразумець, што ў краіне, якая будуе сацыялістычнае грамадзтва, якая скінула 15 з лішкам гадоў таму назад ярмо капіталістаў і памешчыкаў, ня будуць лічыцца з якімі-б там ні было патрабаваньнямі, якія разыходзяцца з інтарэсамі пралетарыяту, пралетарскай рэвалюцыі, дзяржавы пралетарскай дыктатуры, адкуль-бы гэтыя спробы ня выходзілі.

Дзёрзкія, наглыя патрабаваньні некаторых замежных колаў, як я ўжо сказаў, атрымалі заслужаны адпор. Яны будуць атрымліваць яго і надалей, калі хоць на момант забудуць, што маюць справу з СССР, краінай вялікай сацыялістычнай будоўлі, краінай, якая адваявала сабе свабоду ад уласных капіталістаў і памешчыкаў, ліквідавала Кастрычніцкай рэвалюцыяй, якая адваявала сабе дзяржаўную незалежнасьць, якая ўмацавалася і ўмацоўваецца з кожным годам нашага існаваньня на аснове вялікіх сацыяльных, эканамічных і палітычных заваяваньняў вялікага Кастрычніка, на аснове вялікіх посьпехаў нашай першай пяцігодкі, на аснове вялікіх і невычарпальных творчых сіл працоўных мас нашай краіны, якая будуе пад кіраўніцтвам нашай вялікай камуністычнай партыі.

Мы ніколі і нікому не дазвалялі, не дазвалім і не дазволім умешвацца ў нашы ўнутраныя справы, ня гледзячы ні на якія манэўры, гістэрыкі, крыкі, шум і тлум. Нельга не напомніць зараз аб гэтым, аб гэтых крыках, аб гэтых гістэрыках некаторых колаў Англіі, страціўшых роўнавагу, кепска ўсвоіўшых або зусім не пасьпеўшых яшчэ ўсвоіць мысль, выказаную яшчэ тры гады таму назад тав. Сталіным у сувязі з пытаньнем аб «камені пратканьня» ў справе палянізацыі нашых эканамічных сувязей з буржуазнымі дзяржавамі.

Гэтым паном, бачыце, не падабаецца наша Канстытуцыя, наш савецкі лад, наш савецкі суд, і яны выказваюць сваё незадаваленьне і Канстытуцыяй, і савецкімі парадкамі, і савецкім судом пакленнямі, інсінуацыямі, сказаньнямі, фальсыфікацыямі—словам, звычайнымі мэтадамі «маральнага націску» на сваю ўласную прамадкую думку ў сваіх вузкіх, грубых, жорсткіх, бесчалавечных капіталістычных клясавых інтарэсах. Ім не падабаецца, што савецкі суд — гэта клясавы суд, і яны прабуюць рабіць пакленты, што калі гэта клясавы суд, г. зн. суд, які стаіць на варце інтарэсаў рабочай клясы і пралетарскай дзяржавы, то гэта зусім ня суд, і што ў гэтай краіне, дзе суд складаецца з працоўных, дзе суд дзейнічае ў імя інтарэсаў працоўных, дзе суд накіроўвае свае і маральны і палітычны ўплыў супроць эксплёататараў, супроць ворагаў працоўных, то ў гэтай краіне няма правасудзьдзя.

Мы ніколі на ўтойвалі і ня ўтойваем сапраўднай клясавай прыроды нашага суда, сапраўдных клясавых задач, што стаяць перад нашым правасудзьдзем.

Мы заўсёды і ўсюды і вуснымі нашых настаўнікаў і нашай пастаяннай работай на тэарытычных і на практычных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва прызнавалі клясавую прыроду нашага суда, як і ўсёй нашай дзяржавы, ніколі не адрывалі ні адзін нашай задачы ад агульных і асноўных задач ажыцьцяўленьня і абароны інтарэсаў рабочае клясы і ніколі не адрывалі ад гэтых задач і задач нашай судовай сапраўднасьці нашай судовай работы.

Уладзімер Ільліч у самым пачатку рэвалюцыі ўказваў іменна на гэту, сапраўды найвялікшую, асаблівасьць нашага савецкага правасудзьдзя: «На месца старога суда,—гаварыў ён пра нашу Кастрычніцкую рэвалюцыю,—зна пачала ствараць новы народны суд, правільней савецкі суд, набудаваны на прынцыпе ўдзелу працоўных і эксплёатуемых клясаў, і толькі гэтых клясаў, у кіраваньні дзяржавай. Новы суд патрэбен быў перш за ўсё для барацьбы супроць эксплёататараў, прабуючых ад навіц сваё панаваньне або бараніць свае прывілеі, або патаемна, ашуканствам, атрымаць тую ці іншую частачку гэтых прывілеяў».

Савецкі суд ёсьць суд савецкай дзяржавы, суд рабочае клясы, ёсьць суд працоўных нашай краіны, якая ажыцьцяўляе вялізарнейшыя гістарычныя задачы пабудовы ў нашай краіне сацыялістычнага грамадзтва, служыць прыкладам і ўзорам для нашых братоў на клясе ва ўсіх іншых краінах, што змагаюцца за сваё сацыяльнае вызваленьне.

У процілегласьць гэтаму суду, ва ўсіх капіталістычных краінах суд заўсёды быў і застаецца судом, які ажыцьцяўляе і абараняе інтарэсы капіталістычных клясаў, клясаў эксплёатуючых і прыгнятаючых людзкую працу.

«Суд быў,—гаворыць Ленін,—у капіталістычным грамадзтве пераважна апаратам прытнечаньня, апаратам буржуазнай эксплёатацыі».

І калі нам гаворыць аб тым, што вось наш савецкі суд—клясавы суд, і вы, седзячы ў гэтым судзе, творыце неправасудна свае справы, бо вы стаіце на глебе клясавай дактрыны, то гэта ні што іншае, як звычайныя выпады, якія сьведчаць аб звычайных прыёмах фальсыфікацыі і паклёпаў, пры дапамозе якіх эксплёататары прабуюць замазаць сапраўдную клясавую эксплёататарскую сутнасьць свайго ўласнага суда, як і ўсёй сваёй дзяржавы.

Некаторыя паны з ангельскай палаты абшчын прабуюць супроцьпаставіць нашаму суду свой суд і сваё права правасудзьдзе, указваючы на тое, што паміж нашым правасудзьдзем і правасудзьдзем, скажам, ангельскім існуе тая розьніца, якая заключаецца ў тым, што ў ангельскім судзе творыцца правасудзьдзе, а ў савецкім судзе правасудзьдзя шукаць цельга.

Не падабаюцца паном капіталістам і нашы працэсуальныя парадкі і нашы працэсы, накіраваныя супроць контррэвалюцыянэраў і шкоднікаў, заўсёды і нязьменна сустракаючых гарачае падтрыманьне, спачуваньне, абарону з боку пэўных колаў буржуазіі, і ў прыватнасьці, я ад гэтым навінен сказаць іменна на гэтым працэсе,—з боку некаторых пэўных колаў ангельскай буржуазіі.

Міністар гандлю Рэнсімэн сказаў, з поваду нашага працэсу, г. зн. іменна тэй справы, якая зараз зьяўляецца прадметам нашага абмеркаваньня: «Інсцэніроўка працэсаў, накшталт гэтага па абвінавачаньні ў сабатажы, часта адбываецца ў Расіі. Былі зроблены старанныя досьледы, і мы не маглі знайсьці ні аднаго прыкладу, каб адзін з такіх працэсаў ня скончыўся-б асуджэньнем».

Што гэта можа азначаць? Толькі тое, што мы дарма агулам ня садзім людзей на лаву падсудных. Абвінавачая ўлада і органы папярэдняга расьсьледваньня, перш чым пасадзіць на лаву падсудных па абвінавачаньні ў тым ці іншым злачынстве грамадзян сваёй ці чужой краіны, у высокай ступені старанна ўважваюць усе акалічнасьці, у высокай ступені асьцярожна адносяцца да гэтага акту.

Але калі брытанскі міністар гандлю меў на ўвазе сказаць, што ні ў адным з такіх працэсаў мы не сустракаемся з апраўдаўчымі прыгаворамі, то гэта ўжо пераходзіць у простае скажэньне маючых месца фактаў. І для таго, каб доўга на гэтым пытаньні ня спыняцца і каб так, на-хаду абвергнуць падобнага роду цьверджаньні, я зварачаюся да адзнай гістарычнай справы, якая датычыць аднаго з буйнейшых працэсаў, і, да рэчы сказаць, аднаго з буйнейшых шкодніцкіх працэсаў—да Шахцінскага працэсу, па якім былі апраўданы: Пацёмкін, Штэльбрынг, Отта і Мэйер.

Як-жа пасьля гэтага можна гаварыць аб тым, што ў нас працэсы канчаюцца заўсёды асуджэньнем? Праўда, ангельскі міністар гандлю гаворыць аб [illegible] «праведзены, каб зрабіць той вывад, якім ён падзяліўся ў палаце абшчын са сваімі суграмадзянамі. Але трэба сказаць, што гэтыя старанныя досьледы таксама відавочна дэфактны, як і некаторыя турбіны фірмы «Мэтра-Вікерс», аб якіх учора тут гаварыў грамадзянін Манкгауз.

Вы ведаеце, што буржуазія заўсёды прабуе ўтаіць сапраўдную клясавую прыроду ўсіх сваіх устаноў і ў прыватнасьці такой, якою зьяўляецца суд. Можна было-б прывесьці цэлы рад у высокай ступені аўтарытэтных і каштоўных фактаў, якія гавораць імённа аб гэтай гістарычнай і пастаяннай практыцы капіталістычных і эксплёататарскіх клясаў, прабуючых утаіць і замазаць сапраўдную эксплёататарскую сутнасьць сваіх дзяржаўных устаноў, у прыватнасьці—свайго суда.

Але, таварышы судзьдзі, гэта даўно, даўно ўжо было вельмі добра і вычарпальным чынам выкрыта і, у прыватнасьці, і ў адносінах таго, што сабой прадстаўляюць хваленыя суды хапун-б ангельскай дзяржавы. У Маркса ў яго «Ангельскай канстытуцыі» а вычарпальай і забойчай характарыстыкай даецца аналіз клясавай прыроды судоў капіталістычных краін. Гаворыцца, што «ангельскі суд прысяжных, як самы выпрацаваны, ёсьць завяршэньне юрыдычнай хлусьні і амаральнасьці». І сапраўды, што прадстаўляе сабой любы суд капіталістычнай краіны?

Маркс аб ангельскім судзе гаворыць так: «Хто занадта бедны... той атрымлівае на папярэдні разгляд толькі абвінаваўчы акт і першапачаткова дацыя міравому судзьдзі паказаньні і, значыцца, ня ведае ў падрабязнасьцях са браных супроць яго доказаў (а гэта якраз для невінаватых небясьпечней за ўсё); ён павінен зараз-жа пасьля скаваньня абвінавачаньня адказваць, гаварыць можа толькі адзін раз. Калі ён ня вычарпае ўсяго, калі не дастане сьведкі, ён загінуў».

Пасьля гэтага нам гаворыць аб тым, што правасудзьдзе якраз пануе ў тых краінах, дзе мае месца парадак, знайшоўшы ўжо шмат дзесяткаў гадоў таму назад такую бязьлітасную ацэнку, якая дана гэтым установам асноваположнікам навуковага сацыялізму і адным з найвялікшых нашых настаўнікаў—Карлам Марксам. Але з таго часу прайшло шмат год, і кожны год прыносіць новыя і новыя прыклады, якія пацьвярджаюць выключную правільнасьць іменна гэтай ацэнкі. І на сёньня мы маглі-б такіх прыкладаў знайсьці незьлічоную колькасьць.

Клясавая юстыцыя ўсім сваім лёзам накіравана супроць інтарэсаў працоўных і па сутнасьці не зьяўляецца юстыцыяй, правасудзьдзем. Ангельскі журнал «Н'ю-лідэр» характарызуе шуцкі працэс «як найвялікшы скандал у галіне палітычных прасьледваньняў, найбольш ганебны ў судовых анналах сьвету». І хто-ж з людзей, якія сочаць за друкам, ня ведае, што ўжо больш 4 год пягнецца гэты страшэнны працэс, у якім над 30 рэвалюцыянэрамі індусамі і ангельцамі, якія абвінавачваюцца ў камуністычным дзейнасьці і ў арганізацыі рэвалюцыйнага прафесыянальнага руху, у літаральным сэнсе слова зьдзекуецца клясавая юстыцыя. 4 гады цягнулася сьледзтва а допытамі пры дапамозе ўсіх тых мэтадаў, якія знайшлі сваё ўжываньне і ў нядаўна прайшоўшым у Англіі працэсе па абвінавачаньні ў шпіянажы афіцэра Сьцюарта: «3-я ступень», утрыманьне ў нечалавечых умовах, усе меры сапраўды фізычнага і маральнага ўзьдзеяньня,—усё гэта было пушчана ў ход гэтым буржуазным, так званым правасудзьдзем, у абарону якога зараз выступаюць буржуазныя парляманты, якія адважваюцца са сваіх парляманцкіх трыбун кідаць настолькі-ж галяслоўныя, наколькі зьняважлівыя абвінавачаньні ў адносінах да адзінай сапраўды свабоднай у сьвеце краіны, у адносінах да адзінага ў сьвеце сапраўднага правасудзьдзя—правасудзьдзя са вецкага суда, дзе ажыцьцяўляецца воля пралетарыяту, творчага новае жыцьцё, будуючага новае сацыялістычнае грамадзтва.

І калі нашы ворагі гавораць у запале клясавага гневу і сьляпой клясавай нянавісьці, што пры гэтых умовах ня можа ісьці гутарка аб гарантыях, забясьпечваючых устанаўленьне судовай ісьціны і хочуць спаслацца на іншыя так званыя цывілізаваныя краіны, то вельмі ня цяжка будзе адвесьці падобнага роду напады хоць-бы спасылань нам на адзін з навейшых германскіх крымінальна-працэсуальных кодэксаў, іменна на кодэкс 1924 году. Я гавару іменна аб тых гадох, а не аб сёньняшнім эпосе, зьвязанай з перамогай у Германіі фашызму. У адпаведнасьці з параграфам 147 stpo абарона, дапускаемая да ўдзелу ў папярэднім сьледзтве, дапускаецца да прагляду матар'ялаў папярэдняга сьледзтва толькі ў тым выпадку, «калі гэта не пагражае якім-небудзь ушчэрбам мэтам і задачам папярэдняга расьсьледваньня».

Мы гарантуем правы абвінавачаных ня толькі на судзе, але і ў працэсе папярэднятага расьсьледваньня і ў прыватнасьці пры дапамозе таго 206 арт. КПК, аб якім мы ўжо ня раз гаварылі ў працэсе судовага сьледзтва.

Я гэтым пытаньнем займаюся толькі таму, што ўсе тыя агульныя разважаньні, якія мелі месца ў палаце абшчын аб нашым правасудзьдзі, аб нашай судовай сыстэме, аб нашых працэсуальных парадках, мелі месца не абстрактна,—яны мелі месца ў сувязі з гэтай справай, і ў простым разьліку пэўных колаў ангельскай буржуазіі дыскрэдытаваць і папярэдняе расьсьледваньне па гэтай справе, і самы суд, які, зразумела, павінен мець на ўвазе і матар'ялы папярэдняга расьсьледваньня.

Больш таго, мы былі тут сьведкамі таго, як некаторыя падсудныя,—я назаву Тарнтона, я назаву Манкгауза,—прынамсі прабавалі ажыцьцявіць тут перад нашым судом, у ходзе нашага судовага сьледзтва, па сутнасьці гаворачы, тую лінію, якая была ім заказана і знайшла свой адбітак у першым выпуску вядомай нам усім так званай «Белай кнігі». Байка Тарнтона аб «маральным націску», з якой ён з такім сорамам аскандаліўся, байка Манкгауза аб 18-гадзінным допыце, які ў ангельскім парляманце ператварыўся ў 19-гадзінны допыт (яшчэ гадзіна набегла), вэрсія,—я ня ведаю, хто быў ініцыятарам яе,—але вэрсія, тут публічна выпрабаваная Манкгаузам у якасьці мэтаду сваёй абароны, за якую ён павінен быў прасіць у Вярхоўнага суда прабачэньня.

Усё гэта, таварышы судзьдзі, стаіць у простай адпаведнасьці з аднэй тэлеграмай, апублікаванай у «Белай кнізе» за подпісам сэра Вансітарта на імя сэра Эсмонда Овія, якую я хацеў-бы тут прадэманстраваць,—гэта дакумант, які носіць № 27. Гэта тэлеграма прыпадымае некаторую заслону ў інцыдэнце з выступленьнем на судзе Манкгауза. «Савецкі пасол,—тэлеграфуе Вансітарт [illegible] прыкмеце [illegible] васьці, якою зьяўляецца галіна электрабудаўніцтва, электрыфікацыі, электраснабжэньня, галіна, якая зьяўляецца адзнай з важнейшых галін нашага гаспадарчага будаўніцтва.

Праўда, зараз мы маем іншыя формы клясавага супраціўленьня, чым гэта было некалькі год таму назад. Яшчэ з поваду Шахцінскай справы красавіцкім пленумам ЦК нашай партыі было ўказана на свамасаблівасьць гэтага віду злачынства, іменна як праяўленьня асобнай, новай формы клясавага супраціўленьня буржуазіі посьпехам нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта трэба будзе сказаць і гэта трэба будзе з асаблівай сілай падкрэсьліць і ў даны момант.

Аднак, адначасова трэба будзе сказаць, што, ня гледзячы на ўсю навізну адценьняў і форм, у якіх гэта супраціўленьне скінутых, разгромленых, пугнаных да дна, ліквідаваных у сваім эканамічным і палітычным панаваньні капіталістычных эксплёататарскіх клясаў, за гэтымі новымі формамі хаваецца старая клясавая нянавісьць нашых ворагаў, якая не аслабляецца, а наадварот усё больш уманнецца, да справы сацыялістычнага будаўніцтва.

Адзнай з ілюстрацый, цяжкай і яркай ілюстрацыяй, гэтай клясавай барацьбы зьяўляецца гэты працэс, адлюстраваўшы сабой злачынную дзейнасьць паасобных контр-рэвалюцыйных груп, якія пазьбядзяцца яшчэ сям-там у СССР і прабуюць ня толькі сарваць, затрымаць, замарудзіць работу нашых прадпрыемстваў, але нават узарваць паасобныя прадпрыемствы, паасобныя вучасткі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, нанесьці страту нашай сацыялістычнай будоўлі.

І вось тое, што мы тут бачылі на працягу гэтых дзён, усё тое, што мы чулі ад саміх падсудных, няхай гэта Гусеў, або Лабанаў, Сухаручкін або Зорын, Тарнтон або Манкгауз, або Алейнік—адзін з найбольш няпрывабных тыпаў з ліку падсудных, або Кутузава, характарыстыку якой мы дамо некалькі пазьней, усё гэта пераконвае гаворыць сапраўды аб тых клясавых адносінах, сваяасаблівасьці ціпе рашніх форм гэтай клясавай барацьбы, якая праяўляецца, у прыватнасьці, і ў актах шкодніцтва.

Было-б, аднак, у вышэйшай ступені памылковым уяўляць сабе становішча рэчаў так, што гэты працэс электрашкодніцкаў сьведчыць аб тым, аб чым сьведчыў у свой час Шахцінскі працэс,—што і заўсёды мы маем справу з шырока распаўсюджаным зьявішчам шкодніцтва ў колах тэхнічнай інтэлігенцыі. Шахцінская справа сьведчыла аб тым, што гэта шкодніцтва зьяўлялася свайго роду модай—адны шкодзілі, другія прыкрывалі, трэція дапамагалі. Шахцінскі працэс адлюстроўваў даволі папыранае, на сораму нашай тэхнічнай інтэлігенцыі, у той час зьявішча ў яе асяродзішчы. Цяпер справа стаіць ня так. Было-б у высокай ступені памылкова дапускаць яную-б там ні было ў гэтых адносінах паралель па між гэтым працэсам і Шахцінскім працэсам, паміж тымі і цяперашнімі адносінамі да шкодніцтва нашай тэхнічнай інтэлігенцыі.

Нясумненна за гэтыя гады ў сілу і ў залежнасьці ад тых найвялікшых працэсаў, якія адбыліся і ў нашай краіне, атрымаўшай буйнейшыя гіганцкія перамогі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, адбыўся пералом і ў настрої, і ў сьвядомасьці шырокіх колаў тэхнічнай інтэлігенцыі. Гэты вывад ні ў якай меры ня можа быць пахістан тым фактам, што ў 1931-32 годзе яшчэ знайшлася нейкая група шкоднікаў, што, аказваецца, яшчэ ня ўсе шкодніцкія карты будуць біты і ў лепшым выпадку могуць ператварыцца, як гэта даказвае і даны працэс, у кароткатэрміновыя спыненьні турбін, у непрацяжныя па часу затрудненьні, якія дзякуючы пільнасьці, творчай энэргіі, энтузіязму пралетарскіх мас шпарка і рашуча зьнішчаюцца і выпраўляюцца, параліжуючы дзеяньні гэтых шкоднікаў, нэйтралізуючы і ліквідуючы іх развальваючы ўплыў. І сапраўды, ня гледзячы на ўсе іх падрыўную работу, мы маем у галіне электрыфікацыі зьдзіўляючыя посьпехі. Аб гэтых посьпехах гавораць такія факты, як наяўнасьць у нас 10 станцый магутнасьцю звыш 100 тыс. квт.—Капыра, Штэраўка, Шатура, «Красный Октябрь» (Ленінград), Мадэс, Дзяпрадрэс, Дзяпрадрэс, Нівдрэс, Чалябдрэс, Бакінская «Красная звезда». Мы маем вялізарныя посьпехі ў галіне электрыфікацыі, якая зьяўляецца па гістарычнай заўвазе Ўладзімера Ільліча, важнейшым элемэнтам камунізму, бо, як вы памятаеце, па словах тав. Леніна, «камунізм ёсьць савецкая ўлада плюс электрыфікацыя».

Мы мелі ў 1928 годзе толькі 18 раённых станцый з магутнасьцю 610 тыс. квт., а ў 1932 г. мы маем 44 станцыі з магутнасьцю ў 2 з пал. млн. квт. Мы маем цяпер магутнасьць усіх станцый у 4.600 тыс. квт. супроць 1.875 тыс. квт. у пачатку першай пяцігодкі.

Мы мелі ў 1928 г. колькасьць электраэнэргіі, якая вымяраецца ў 5 млрд. квт. гадзін, а ў 1932 годзе мы маем 13 з пал. млрд. квт.—гадзін у год.

Я ўжо ўказваў на тое, што мы, дзякуючы вялізарнейшым намаганьням, вялізарнейшым ахвярам, вялізарнейшаму самаахвяраваньню, настойлівасьці, працы, маем 10 станцый магутнасьцю звыш 100.000 квт. Сярод іх ёсьць тыя самыя станцыі, з якімі нам зараз, на жаль, прыходзіцца мець справу, калі мы гаворым аб шкодніцкіх групах, аб контр-рэвалюцыйных гнёздах, якія пра бавалі пазваліць малады арганізм гэтага гаспадаркі, які яшчэ будуецца.

У сучасны момант, як я ўжо сказаў, зьмяніліся ў значнай ступені ў параўнаньні з тым, што мы мелі ў мінулыя гады, і мэтады шкодніцтва. У данай справе з усёй выразнасьцю сказаліся асноўныя чатыры спосабы шкодніцтва: па-першае, заведамае, наўмыснае ўтойваньне дзяржаўнымі служачымі, пастаўленымі на адказныя пасады, тых дэфактаў, зьнішчэньне якіх зьяўлялася іх першым і простым абавязкам.

Другое—зацягваньне работ усякімі штучнымі спосабамі: непатрэбным рамонтам, дрэнным мантажам і г. д., падаўжэньнем пускавых пэрыядаў, адтэрмінаваньнем выпрабавальных тэрмінаў, найбольшым падаўжэньнем гэтых тэрмінаў.

Трэцяе—простае псаваньне агрэгатаў, як гэта мы бачылі, напрыклад, у выпадку, аб якім тут так эпічна спакойна апавядаў Гусеў, калі расказваў аб псаваньні ім матораў у 1.400 конскіх сіл, або Катляроўскі, калі гаварыў аб тым, як ён усунуў болт у міжжалезны прастор паміж ротарам і статарам і вывеў такім прыёмам турбагенэратар са строю.

Чацьвертае—больш утончаныя, больш майстэрскія, больш хітрыя і больш скрытыя замаскаваныя мэтады шкодніцтва ўладу на нашай гаспадарцы, калі сьвядома падбіраюцца адпаведныя шкодніцкім мэтам кадры, калі сьвядома ставяцца на больш адказныя вучасткі работы менш падрыхтаваныя для гэтай работы людзі, калі больш адказная і важная работа заведама і сьвядома для арганізуючых гэту шкодніцкую справу даручаецца тым, хто менш падрыхтован або зусім не падрыхтован да гэтай работы, з простым разьлікам, што неправеранны качагаў засьне, што нявопытны мэханік не зразумее, у чым справа, ня здолее своечасова адкрыць клапан, які патрэбна, або, наадварот, закрые клапан, які непатрэбна і г. д. і г. д. Вось цяперашнія мэтады і спосабы шкодніцтва, якія ўладаюць усімі неабходнымі для посьпеху гэтага шкодніцтва якасьцямі, калі шкоднік можа дзейнічаць з вельмі малой рызыкай, калі, дзейнічаючы такім чынам, ён можа разьлічваць на вельмі вялікую беспакаранасьць, калі ён, нарэшце, можа разьлічваць на працяжнасьць самога тэрміну сваёй шкодніцкай работы. Гэтыя шкодніцкія дзеяньні тым і небясьпечны, што яны, будучы вельмі часта самі па сабе дробнымі, у той-жа час правадзімыя сыстэматычна з дня ў дзень, на кожным кроку, закранаючы кожны агрэгат або мноства асобных агрэгатаў, іменна гэтай сваёй штодзённасьцю здольны ў некаторых прытупляць чулыя і насьцярожаныя адносіны да гэтых зьявішч.

Тут характэрна іменна форма гэтых шкодніцкіх актаў, вельмі зручная для таго, каб прыкрыць гэта шкодніцтва ўсякага роду «аб'ектыўнымі прычынамі», «непаладкамі», тым, што як быццам зусім не залежыць ад злой чалавечай волі.

Мы ведаем, што ў цяперашні час клясавы вораг, разгромлены, разьбіты, ня зможа, ня здолее, як-бы ён гэтага ні жадаў, пайсьці простай атакай супроць савецкай улады, супроць сацыялістычнага будаўніцтва, на якім-бы вучастку гэтага будаўніцтва ён ня выявіў сваю прысутнасьць. Мы ведаем, што ад гэтых простых лобавых ударaў клясавы вораг, пацярпеўшы жорсткае паражэньне, перайшоў да другіх мэтадаў, дзейнічаючы так званай ціхай сапай. Іменна гэтым тлумачыцца тое, што ён становіцца менш лёгка ўлоўным, менш лёгка паражальным і менш, зна чыцца, даступным для ізаляцыі.

Але ў гэтым і заключаецца вялізарная небясьпека гэтых злачынстваў, саміх па сабе можа быць дробных, але ва ўсёй сваёй злучнасьці складаючых вялізарную сацыяльную небясьпеку. Сацыяльная небясьпека злачынстваў, якія складаюць зьмест данай справы, заключаецца ня ў тым, што ўзарваны станцыі, ня ў тым, што выведзены са строю моцныя, буйныя, уладаючыя вялікай магутнасьцю турбіны, што разбурана і расстроена ўся сыстэма электраснабжэньня.

Не. Але гэтага і быць не магло, гэтага і быць ня можа, бо фабрыкі ў нас знаходзяцца ў руках пралетарыяту, бо рабочая кляса даволі пільная для таго, каб прадухіліць такія цяжкія вынікі, якія маглі-б быць пры ўмове беспакаранай дзейнасьці шкодніцкіх груп і паасобных шкоднікаў. Небясьпека гэтых злачынстваў, якімі мы займаемся ў нашай справе, заключаецца ня ў гэтым, а ў тым, што злачынцы прабуюць біць на дробязях, стварачы бязьлюдныя затрудненьні, бязьлюдныя «аварыйны стан», як гэта мы бачылі на асобных прыладах на асобных станцыях—на Зуєўцы, на Масанэрга,—на Гдрэсе, на Златаусту, на Чалябдзе і г. д. і г. д.

### III. ЗДРАДА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Тут, на працягу ўсяго гэтага працэсу, некалькі раз некаторыя абвінавачаныя былі зроблены спробы растлумачыць свае дзеяньні тым, што яны, маў, аказаліся ўцягнутымі ў гэту контррэвалюцыйную дзейнасьць другімі асобамі і ў прыватнасьці ангельскімі мантажнымі інжынэрамі, што сядзяць на лаве падсудных.

Мы павінны раз назаўсёды на ўсю нашу краіну заявіць аб тым, што дзяржаўныя служачыя ёсьць дзяржаўныя служачыя, да якіх у нас будуць адносіны як да дзяржаўных служачых у тых выпадках, калі яны будуць дзейнічаць так, як дзейнічаюць падсудныя, прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці на данай справе.

Я павінен буду напомніць пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ад 14 сакавіка гэтага году, якая, хоць і зьвернута непасрэдна да АДПУ, мае для нас найглыбейшае прынцыповае значэньне. Пастанова, якая гаворыць аб асабліва строгай адказнасьці служачых у дзяржаўных установах і прадпрыемствах за шкодніцкія акты, якія імі робяцца і за якія яны павінны адказваць асабліва строга, і што гэта асабліва строгасьць будзе дастасавана ў адносінах да ўсіх выкрытых у гэтых злачынствах служачых у дзяржаўных установах і прадпрыемствах.

Вось чаму дзяржаўнае абвінавачаньне, якое надрымлівае абвінавачаньне па данай справе супроць асоб, што сядзяць на лаве падсудных, будзе і ў далейшай сваёй ацэнцы і кваліфікацыі ступені адказнасьці і віны асобных падсудных выходзіць іменна з гэтых меркаваньняў, маючы на ўвазе, што мы павінны самым суровым чынам адказаць на кожную спробу здрадзіць сваёму абавязку дзяржаўнага служачага, і, я-б сказаў нават больш, — нават незалежна ад ступені і аб'ёму нанесенай дзяржаве гэтымі злачынствамі шкоды.

У гэтай справе дзяржаўнае абвінавачаньне лічыць асноўнымі і галоўнымі вінаватымі дзяржаўных служачых і супроць іх абвінавачаньне ў першую чаргу накіроўвае сваю вострасьць, доказы і патрабаваньні суровай крымінальнай рэпрэсіі. Яны адрадзілі сваёй пралетарскай дзяржаве, і мы да іх адносімся тому інакш, чым адносімся да служачых прыватных фірм, прыватных контор і сваіх і чужых. Зразумела, калі-б яны злачынствы, зробленыя Тарнтонамі і Манкгаузамі, ішлі і Манкгаузамі. Але няма сноў, каб выказаць усё патушыць абурэньне, каб знайсьці формулу нагарды, гаворачы аб адказнасьці дзяржаўных служачых нашай краіны, забыўшых свой абавязак перад сваёй радзімай, адрадзіўшых сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыне.

У гэтай справе дзяржаўнае абвінавачаньне лічыць асноўнымі і галоўнымі вінаватымі дзяржаўных служачых і супроць іх абвінавачаньне ў першую чаргу накіроўвае сваю вострасьць, доказы і патрабаваньні суровай крымінальнай рэпрэсіі. Яны адрадзілі сваёй пралетарскай дзяржаве, і мы да іх адносімся тому інакш, чым адносімся да служачых прыватных фірм, прыватных контор і сваіх і чужых. Зразумела, калі-б яны злачынствы, зробленыя Тарнтонамі і Манкгаузамі, ішлі і Манкгаузамі. Але няма сноў, каб выказаць усё патушыць абурэньне, каб знайсьці формулу нагарды, гаворачы аб адказнасьці дзяржаўных служачых нашай краіны, забыўшых свой абавязак перад сваёй радзімай, адрадзіўшых сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыне.

У хачу скарыстаць тэту частку сваёй прамовы, каб рашучым чынам адкінуць усякія спробы, якія рабіліся Манкгаузам, пацягнуць абвінавачаньне на шлях нападу на асобныя чужаземныя фірмы, у прыналежнасьці на фірму «Мэтра-Вікерс», як быццам-бы на лаве падсудных сядзець не Манкгаўз, а фірма «Мэтра-Вікерс». Злачынствы асобных падсудных або маскоўскай дзяржавы «Мэтра-Вікерс», або іншае злачынныя дзеяньні адзіночных асоб за межамі СССР, якія маюць адносіны да гэтай канторы, мы ніяк ня схільны [illegible], як дзеяньні, зробленыя гэтай фірмай, за якія гэта фірма пагінна несьці адказнасьць, як такавая. Мы гаворым аб адзіночных асобах, якіх гэта Манкгаўз або Рычардс, мы гаворым аб асобных злачынствах як тых, якія знаходзяцца зараз на нашым разгляде, так і тых, якія не знаходзяцца на нашым разгляде і даны час, без якіх-бы там ні было адносін да фірмы, у адносінах да якой Манкгаўз сёньня зрабіў спробу пастаўць пытаньне так, як быццам гэта ня ён, а фірма сядзіць на лаве падсудных.

### IV. ТРЫ ЛІНІІ АБВІНАВАЧАНЬНЯ

Я ўжо сказаў, што дзяржаўнае абвінавачаньне будуе сваё абвінавачаньне ў адносінах на падсудных на гэтай справе на трох асноўных кірунках.

Па пытаньні аб ваенным шпіянажы ў ходзе судовага сьледзтва было шмат гутарак, і некаторыя з падсудных рабілі выгляд, што яны, на сутнасьці кажучы, не даволі ясна сабе ўяўлялі зьмест гэтага паняцьця. Гэта неяк ўпарта і настойліва прабавай яким тут даказаць Тарнтон, які гаварыў, што шпіянаж у яго ўяўленьні (а гэту версію падтрымліваў і Манкгаўз, а за імі двума іншы потым і другія абвінавачаныя з ангельскіх прамадзтваў, напрыклад, Кушні) вельмі сур'ёзна разыходзіцца з тымі ўяўленьнямі, якія ён затрымаў у працэсе папярэдняга расьсьледваньня з фармулёвак, прадпаўленых яму абвінавачаньнем. Усе яны рабілі выгляд, што пытаньне на нашаму савецкаму праву ў іх уяўленьні ёсьць зьбіранье «усякіх» вестак і што там, калі яны гаварылі аб прыналежнасьці сабе вінаватымі ў зьбіраньні шпіёнскіх вестак, яны гаварылі, калі хочаце, і праўду і няпраўду. Праўду таму, што яны ўжывалі гэтыя словы «шпіёнскія весткі», а няпраўду тому, што пад гэтымі словамі яны прадстаўлялі сабе зусім ня той зьмест, які адпаведае адпаведным арт. арт. нашага Крымінальнага кодэксу.

Мы ведаем, што і адзіночныя асобы, якія знаходзяцца на нашай тэрыторыі, і нават цэлыя групы гэтых асоб займаюцца зьбіраньнем розных вестак на тэрыторыі нашай краіны. Але мы ніколі не прадпаўлялі і ня думаем прадпаўляць каму-небудзь абв

# Працяг прамовы тав. Вышынскага

абстаюўцы канфіскаць супроць нашых інтарэсаў. Мы ня можам, скажам, патрабаваць, каб асобы, якія належаць да іншых клясаў, стаялі на гнебе зусім іншых, уласцівых ім клясавых інтарэсаў, маючых зусім паўнае сьветаразуменьне і адносіны да навакольнай іх рэчаіснасьці, успрымалі зьявы нашай рэчаіснасьці так, як успрымаем мы, савецкія людзі.

Але, зразумела, гэта не дае і не павінна дачаць нікому ніякіх падстаў прабаваць прыкрываць сапраўдную шпіёнскую работу ў сапраўдным значэньні гэтага слова ўказаньнем на тое, што гэта «абъяктывныя весткі», як прабаваў сьцьвярджаць тут Тарнтон, спасылаючыся да таго-ж на нібыта вельмі шырокае разуменьне шпіянажу з пункту гледжаньня нашага савецкага права. А Тарнтон так і гаворыць, што, прыпаючы сябе вінаватым у шпіянажы, ён думаў, што ў нас шпіёнскімі весткамі лічацца ня весткі, якія маюць ваенна-дзяржаўнае значэньне, як гэта ёсьць у сапраўднасьці, а ўсякія весткі, і ў тым ліку такога роду весткі, аб якіх мы гаварылі ўжо вышэй. Чаму ён так мог гаварыць? Магчыма, таму, што хацеў выкарыстаць сапраўды даволі шырокія вэрасьцяньні ў гэтай галіне права капіталістычных краін, згодна якім пад шпіянаж можна падвесьці і такія дзеяньні, якія накіроўваюцца і супроць інтарэсаў асобных капіталістычных груп або нават асобных капіталістаў.

Наша права для гэтага не дае ніякіх падстаў. Мы маем зусім дакладнае паняньце аб шпіянажы. Яно ў высокай ступені дакладна фармулявана ў нашых дзейных законах, і з пункту гледжаньня іменна нашых дзейных законаў мы і пастараемся будаваць сваё абвінавачаньне ў шпіянажы, якое мы прад'яўляем на нашай справе цэлому раду абвінавачаньняў.

Але перад гэтым некалькі слоў аб тым, як глядзяць на пытаньні аб шпіянажы розныя замежныя дзяржавы? Калі зьвернуцца да ангельскага права, то мы тут для адказу на данае пытаньне маем матар'ял у выглядзе закону 22 жніўня 1911 году аб дзяржаўных таінах і такі-ж закон пад аналягічнай назвай ад 1920 году, Артыкул 2-ні закону аб дзяржаўных таінах ад 22 жніўня 1911 году, прадстаўляючага сабой новую рэдакцыю закону 1889 году, гаворыць наступнае: «Пры крымінальным праследваньні на падставе гэтага артыкулу не патрабуецца, каб віна абвінавачанага была ўстаноўлена якім-небудзь паўным дзеяньнем, даказваючым мету, якая пагражае бясьпечнасьці і інтарэсам дзяржавы. Абвінавачаны можа быць асуджаны, хоць-бы такое дзеяньне і ня было ўстаноўлена, калі з аналічнасьцяй справы, з яго паводзін або з даказаных уласьцівасьцяй яго характару відаць, што мэта, якую ён праследаваў, заключала ў сабе пагрозу бясьпечнасьці і інтарэсам дзяржавы».

Вось так буржуазія абараняе інтарэсы сваёй дзяржавы, свае клясавыя інтарэсы, калі ставіць пытаньне аб адказнасьці па артыкулах аб шпіянажы.

І далей: «Калі які-небудзь адымак, плян, узор, матар'ял, заметка, дакумант або весткі, якія маюць адносіны да месца, забароненага ў сэнсе гэтага закону, або да прадмету, які знаходзіцца ў такім месцы, ці якія скарыстоўваюцца ў ім, будзе сабрана, абвешчана або перадана асобам, ня маючым на гэта законных паўнамоцтваў, то да таго часу, пакуль адваротнае ня будзе даказана, павінна лічыцца, што названыя прадметы або весткі былі падрыхтаваны, здабыты, сабраны, запісаны, агалошаны або пераданы з метай папраўжаючай бясьпечнасьці інтарэсаў дзяржавы».

Вось як буржуазія абараняе свае інтарэсы ў гэтай галіне.

А што такое з пункту гледжаньня ангельскага закону 1911 году гэтыя самыя «забароненыя месцы», г. зн. «месцы, забароненыя ў сэнсе гэтага закону»? Адказ на гэта пытаньне і вельмі ясны адказ дае наступны пункт артыкул, які складаецца з цэлага раду разьдзелаў, у тым ліку і разьдзелу, што зьмяшчае наступны пералік:

«Усе чыгуначныя шляхі, дарогі, праезды, каналы і інш. сродкі зносін па сухазем'і ці на вадзе, уключаючы ўсе пабудовы, якія складаюць іх частку або знаходзяцца ў сувязі з імі, усе месцы, што скарыстоўваюцца для выдачы газавай, вадзяной, або электрычнай энэргіі, ці для іншай работы дзяржаўнага значэньня» і г. д.

Вось што гаворыць гэта артыкул, напэўна добра вядома Тарнтону, як былому вайскоўцу і як цяперашняму ваеннаму шпіёну.

Вось якія законы існуюць, пр-н Тарнтон, у вашай дзяржаве, абараняючай тайны ваенна-дзяржаўнага характару, за парушэньне якіх дастасоўваюцца над звычай суровыя пакараньні, за парушэньне якіх вінаваты ў гэтым падпадае надзвычай суровай адказнасьці. Побач з гэтым права капіталістычных дзяржаў ведае яшчэ і паняцьце эканамічнага шпіянажу ў сэнсе ахоўваньня так званых прамысловых тайн. Для прыкладу можна спаслацца хаця-б на германскі закон ад 9 сакавіка 1932 г. Мы ня ведаем прамысловых тайн у сэнсе капіталістычнага права, але і ў нас ёсьць паняцьце эканамічнага шпіянажу, пад якім разумеецца зьбіраньне і разгалашэньне эканамічных вестак, якія зьяўляюцца весткамі, што спецыяльна ахоўваюцца дзяржавай і пералічаны ў пераліку, спецыяльна ўказаным у адпаведных законадаўчых актах, у даным выпадку, пастанове СНК СССР ад 27 красавіка 1926 году, якая зьмяшчае вычарпальны пералік тых вестак, якія, будучы раскалошаны, даюць падставу для прад'яўленьня абвінавачаньня ў злачынстве, падыходзячым пад паняцьцё эканамічнага або ваеннага шпіянажу.

Вядома, розныя меркі, розны падыход да гэтых пытаньняў у розных дзяржавах тлумачыцца рознай прыродай гэтых дзяржаў. Трэба наогул мець на ўвазе, калі мы гаворым аб дзяржаве пралетарскай дыктатуры, аб Савецкай дзяржаве, што мы маем справу з дзяржавай абяцлівага роду, якая, на словах Уладзімера Ільліча, зьяўляецца на сутнасьці ўжо поўдзяржавай. І сапраўды, наша дзяржава ажыцьцяўляе задачы абароны інтарэсаў рабочае клясы, інтарэсаў працоўных мас, асноўная і адзіная мэта і задача нашай дзяржавы заключаецца ў абароне і ахове гэтых інтарэсаў, у барацьбе супроць усякага роду эксплёататарскіх зьяў, супроць эксплёататарскіх клясаў. Відома, наша дзяржава зусім іншага тыпу, іншага роду, іншай прыроды, чым эксплёататарская дзяржава. І хоць мы часта ўжываем слова — дзяржава, але мы ніколі не павінны забываць, што сама прырода нашай дзяржавы ў адрозьненне ад буржуазных дзяржаў абавязвае нас да іншага падыходу ў вырашэньні розных задач нашага дзяржаўнага будаўніцтва, чым гэта мае месца ў гэтых буржуазных дзяржавах.

Так стаіць справа, у прыватнасьці, і з пытаньнем аб адказнасьці нашых дзяржаўных служачых, аб якой я гаварыў у папярэднім сваім выказваньні.

Трэці разьдзел злачынстваў, з якімі мы зараз маем справу ў даным працэсе, — гэта разьдзел, які назваў словам подкуп. І тут трэба зноў-такі выходзіць з прынцыповых асаблівасьцяй нашага савецкага жыцьця, нашага савецкага ладу, з аднаго боку, і прынцыповых асаблівасьцяй, якімі характарызуецца быт, звычкі, норавы і сыстэма ўзаемаадносін у розных колах розных капіталістычных краін — з другога. Маркгаўз ня мог згадзіцца з абвінавачаньнем у ацэнцы трох тысяч рублёў, якія былі даны Долгаву ў якасьці хабару, цьвердячы, што гэта быў не хабар, што гэта быў падарунак. Зразумела, ніводзін хабар, паняцьце зладзейства, як і іншыя паняцьці, аб якіх я ўжо раней гаварыў, у вас і ў буржуазным грамадзтве бываюць вельмі часта рознымі, і гэта ацэнка натуральна.

У Ул. І. Леніна ёсьць адно месца, дзе ён гаварыў аб гэтай розьніцы. Даводзьце мне прывесьці гэты красамоўны прыклад: «Калі рабочы, — пісаў Ленін, — украдзе бутку, дык яго ў буржуазнай краіне пасадзяць за гэта ў турму, а калі багаты ўкрадзе чыгунку, дык яго пакажуць сэнатарам»... Гэта сапраўды сьведчыць аб найвялікшай прынцыповай розьніцы пункту гледжаньня на рэчы.

Так і ў галіне хабараў. Мы гаворым аб хабары, як аб разьвядзалочым наш арганізм зьле, з якім трэба самым жорсткім, самым бязьлітасным чынам змагацца, стараючыся выпаліць гарачым жалезам з сыстэмы нашых адносін такія зьявы, як хабарніцтва. А між тым мы ведаем, што ў буржуазных колах, — пасобных, вядома, я не хачу рабіць тут загада шырокіх абагульненьняў, — у пасобных, буржуазных колах, прадпрымальнікі, дзяльцы, банкіры і г. д., дый ва ўсім буржуазным грамадзтве ў цэлым, калі мы гаворым аб гэтым прынцыпова, хабар ня лічыцца злачынствам, бо на хабары прымаецца пэрадка ўвесь дабрабыт розных выказчык, кар'ерыстаў, парляманцкіх і біржавых дзяльцоў і г. д.

Усе вашы, грамадзяне Маркгаўз і Тарнтон, гуталі аб тым, што гэта «падарунак», бо ён «невялікі», бо ён дасьцца за «работу», за тое і тое, дзе нас не перакананчыць. Такія «падарункі» мы разгадваем, як хабар, бо гэта ёсьць такога роду дзеяньні, якія цягнуць за сабой пераключэньне ўвагі, энэргіі, імкненьняў, жаданняў, абавязкаў ад інтарэсаў дзяржавы да прыватных інтарэсаў, вельмі часта ў пэўных выпадках процьцілых інтарэсам дзяржавы.

Так, і так гэта і з вашай фірмай, у адносінах да якой мы, — я яшчэ раз гэта паўтараю, — ня маем данных для прыцягненьня на гэтай справе да крымінальнай адказнасьці, але якая навоўле вашых-жа ўласных слоў і паказаньняў, пр-н Маркгаўз, ад якіх вы прабавалі адысьці пасьля таго, як вы іх зафіксавалі ўласным подпісам, — выкопнае вельмі часта нядобрасумленна свае абавязкі ў адносінах да савецкай дзяржавы. Апошняе вы тут самі характарызавалі такім чынам, што калі-б вы былі пакупцом, дык вы ня купілі-б такога абстаўлаваньня, якое вы, як прадавец, адмаўляецеся, аднак, прадаваць за пралетарыя народныя грошы, што выплачваюцца вам нашай краінай за гэта абстаўлаваньне.

Я хачу напомніць тут некалькі законаў ангельскага стаўпчэтвора права, прысьвечаных іменна гэтаму пытаньню аб хабарніцтве. Вось, напрыклад, мы маем закон 1889 г. аб хабарніцтве ў публічна-прававых арганізацыях. З гэтага закону відаць, як буржуазія ўмее свае прамадзкія арганізацыі, свае арганізацыі публічна-прававога характару абараняць спражой і мацней, чым прыватныя прадпрыемствы, калі гэтыя прыватныя прадпрыемствы і арганізацыі адказваюцца ўступаць у супярэчнасьць з дзяржаўнымі інтарэсамі.

Мы маем закон 1906 г., які носіць характэрную назву «аб папярэджаньні каррупцыі», тэй самай каррупцыі, якою абвінавачаныя сыстэматычна тут займаліся над прыкрыцьцём сваёй фірмы, і аналягічны закон 1916 г.

Па закону 1889 г. хабарам лічыцца «прадастаўленьне каму-небудзь (так і сказана, пр. Маркгаўз) у якасьці хабару абяцаньня, прапановы, падарунку, пазыкі, узнагароджаньня, або чаго-небудзь іншага, маючага капітоўнасьць, што павінна падштурхнуць яго штонебудзь зрабіць або ўспрымацца ад выкананьня чаго-небудзь, маючага адносіны да справы, у якой прымае ўдзел публічна-прававая арганізацыя».

Тое-ж самае па закону 1906 г., дзе гаворыцца наступнае: «Калі хто-небудзь, дзеючы чаго-небудзь прадстаўніка, прымае або дае, каб яму былі даны, або згодзіцца прымаць ад каго-небудзь для яго самога ці для другой асобы падарунак або што-небудзь, маючае капітоўнасьць, для пабуджэньня да выкананьня або ўспрыманьня ад выкананьня» і г. д... гэта ўжо ёсьць хабар.

Вось як гаворыць законы, законы тэй краіны, якая вас, абвін. Маркгаўз, Тарнтон і інш., сюды паслала для нэўных мэт у сілу дагавору, існуючага паміж нашымі ўстановамі і вашай фірмай, прадстаўніком якой вы, Маркгаўз, тут у Маскве, зьяўляецеся. Хабар ёсьць хабар. Як бы яго ні называлі, ён ня зьменіць сваёй сутнасьці і па законах буржуазнай дзяржавы, і тым больш, па нашых законах.

Можа паўстець юрыдычнае пытаньне аб тым, чаму ў нашым абвінавачаньні не прад'яўлен спецыяльны артыкул, які-б гаварыў аб хабарніцтве, тады, як мы абвінавачаем у хабарніцтве. Чаму яго тут няма? Чаму сярод усіх гэтых артыкулаў — 58-6, 7, 9, 11 — не знайшлося месца для спецыяльнага артыкулу, гаворачага аб хабарніцтве, — 118 арт. КК? Адказ на гэта пытаньне вельмі просты: таму, што хабар у тых умовах, пры якіх зьяўляецца даволі ўпружтаранным прад'яўленьне абвінавачаньня і буду спадзявацца, асуджэньне па гэтым прад'яўленым намі абвінавачаньні ў злачынствах контр-рэвалюцыйных, зьяўляецца толькі сваясаблівай формай праўленьня гэтага контр-рэвалюцыйнага злачынства, таму, што ў гэтых умовах і пры гэтых аналітычных хабар па самой сваёй сутнасьці зьяўляецца контр-рэвалюцыйным злачынствам, зьяўляецца буйнейшым і найпяжэйшым дзяржаўным злачынствам.

## V. АРГАНІЗАЦЫЯ АВАРЫЙ НА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯХ

Пераходзячы да характарыстыкі пасобных злачынстваў, зробленых кожным з падсудных, неабходна даць характарыстыку тых падзей, якія мелі месца ў сувязі з гэтай злачынной дзейнасьцю на тых ці іншых электрастанцыях, і даць, нарэшце, кваліфікацыю гэтых злачынстваў з пункту гледжаньня папрабаванняў нашага крымінальнага закону.

Дазвольце мне і перайсьці да кароткай характарыстыкі становішча справ, якія стварыліся на кожнай з гэтых станцый у сувязі, а часткова і ў простай залежнасьці ад злачынна-шкодніцкай, контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці, цьвязаных з гэтымі станцыямі і працуючымі на гэтых станцыях контр-рэвалюцыянэраў і шкоднікаў, прыцягнутых па гэтай справе.

**Златаустаўская электрастанцыя.** У перыяд часу 1931-32 гг. на Златаустаўскай электрастанцыі мы насіраем рад аварый, якія сыстэматычна паўтараюцца з месяца ў месяц. Мы мелі тут рад аварый, не адну аварыю, а рад аварый з моторам у 1.400 к. с., які абслугоўвае, як вы памятаеце з даных нашага судовага сьледзтва, буйна-гатунконы стан пракаатнага цэху, якія непасрэдна абслугоўваў выторчасьць раду заводаў, і ў тым ліку ваенныя цэхі і ваенныя заводы.

Мы мелі аварыі з моторам у 1.400 к. с. на Златаустаўскай электрастанцыі: 10 красавіка, 12 мая, 18 чэрвеня і г. д., і г. д. на працягу гэтых двух год, але гэта ня значыць, што гэтых аварый ня было раней. Гэтыя аварыі былі і да гэтага. Мы маем рад аварый з моторам у 1.400 к. с., якія мелі сваім простым вынікам спробу нанесьці ўдар на тэй выторчасьці, якая ў сваю чаргу мела асноўнае значэньне для пракатчыкі, і ў прыватнасьці мела асноўнае значэньне для ваеннай выторчасьці. 5-6 раз заседаў выводзіцца матор га строю з прычыны сьвядомай, наўмыснай шкод найкай работы некалькіх асоб: Гусева, Сокалава, Макдональда, на гэтым іменна вучастку скандэнсацэрваўных сваю асноўную ўвагу і напружэньні ўсе свае намаганьні, каб біць па гэтаму, вельмі важнаму з пункту гледжаньня абарончага ходу выторчасьці, і ў ры бяспасьці, ваеннай выторчасьці, апрэгату гэтай электрастанцыі.

На гэтым справа не абмяжоўваецца — мы маем факт замарожваньня катла № 3, калі ня былі закрыты шыберы — такгама зусім сьвядома, і калі гэта прывяло такгама да аварыі.

У канцы 1931 году выводзіцца са строю на той-жа электрастанцыі турбіна-ла. Пры дзьвёх вуцілятарах, з якіх адна адпрыгнае пазыцыю і рэш

вельмі тонка, пад відам некаторага роду пераабсталяваньня, — такгама свайго роду рацыяналізацыі, аб якой тут гаварыў падсудны Гусеў, — разбураюць фундамант, а потым пачынаюць рамонт вуцілятарачы, выводзячы яе са строю і пакідаючы станцыю ў такім стане, які на іх шкодніцкай мове атрымаў спецыяльна тэхнічную фармулу — «аварыйны стан станцыі».

Мы маем, нарэшце, затрыманьне ў пераабсталяваньні катлоў № 1, 2 і 11, што прывяло станцыю ў такое становішча, калі яна падчас была мець і мела ў сапраўднасьці тонны пашкоджаную магутнасьць, і пашкоджаную вельмі значна, прыкладна, напалову — з 12.000 кілёват нармальнай магутнасьці магла разьвіць ледзь толькі 6.000 кілёват. Вы памятаеце, так, судзьдзі, як гэтыя аварыі рабіліся. Нельга сказаць, каб яны рабіліся ўжо вельмі складаным спосабам. Наадварот, як паказваў тут ужо Гусеў, аварыі з моторам у 1.400 кзн. сіл была выклікана вельмі лёгкім шляхам — увядзеньнем у мяжкалежны прастор паміж статарам і ротарам рабочага металёвага прадмету.

Аналізуючы прычыны гэтых аварый, і ў прыватнасьці і важней за ўсё аварыі 10 красавіка, мы бачым, што цэлы рад другіх аварый з тым-жа матором, аб якім я гаварыў зараз, — аварыі 12 і 13 чэрвеня і іншыя,—зьяўляліся простым рэзультатам надобразгаканага, нядобраумыленнага зьмянчэньня прычын першай аварыі, сьвядомага і наўмыснага дрэннага рамонту пасьля першай аварыі. Аналізуючы прычыны гэтай аварыі, экспэртная камісія прыйшла да заключэньня, што зьмянчэньне статарнага жалеза мала адбіцца а-за трапляньня ў мяжкалежны прастор рабочага металёвага прадмету і што ў нармальных экспляатацыйных умовах рабочае жалеза не магло трапіць у матор і можа быць упісчнута туды толькі штучна.

Але тады, калі экспэртная камісія знаходзіла гэтыя даныя, апіраючыся на аварыйны акт, яна, вядома, ня мела на ўвазе пазнаньняў Гусева, якія прайшлі тут перад судом, у якім Гусеў расказаў сам, як у сапраўднасьці гэта рабочае жалеза трапіла ў матор, як яно было туды ўкладзена сьвядома, нецымсна, у выніку шкодніцкіх намаў, на аснове якіх разгарталася ўся дзейнасьць Гусева ў гэты перыяд.

Зімой 1932 году на Златаустаўскай электрастанцыі здарылася новая аварыя з катлом № 8, які стаіць у галодным рэзэрве. І гэта аварыя была зроблена наўмысна і, як выявілася, ня бог ведае якім мудрым спосабам — ня

шчаная вада, а калі прышла зіма, кацёл замёрз і разарваўся рад трубак.

Мы маем, такім чынам, рад аварый, якія ўсе зьяўляюцца рэзультатам наўмыснай контр-рэвалюцыйнай дывэрсыйнай дзейнасьці людзей, якія, будучы пастаўлены ўладай, пастаўлены рабочай клясай, нашай пралетарскай рэвалюцыяй на пасты, на якіх ім была даверана дзяржаўная мэмасьць, ня толькі не хавалі і не хаваюцца яе, але прабавалі яе пазнаць і калечыць, падрыхтоўваючы і робячы дывэрсыйныя акты, вядучы хоць і ў скрытай, замаскаванай форме, але сапраўдную вайну з рабочай клясай цілямам разбурэньня, шляхам зьмянчэньня нашай дзяржаўнай мэмасьці.

**Зуеўская электрастанцыя.** У чэрвені — ліпені 1932 г. на Зуеўцы здарылася аварыя з генэратарам № 3. Як яна адбылася? Аб гэтым гаварыў тут Катляроўскі, вельмі спакойна гаворыць. Я нават думаў, што Катляроўскі, як я гэта далей пазнаю буду сказаць і аб некаторых другіх, напрыклад, аб Сухаручкіну, напэўна, адчуваў сябе тут як-бы на акадэмічным пасяджэньні якога-небудзь навукова-тэхнічнага таварыства, дзе ён рабіў спакойны акадэмічны даклад аб сваіх дасягненьнях у галіне шкодніцтва. Паразьлівы малюнак, зьяўляючы малюнак! Жаліва, калі інжынэр, сапраўды закліканы стаяць, калі інжынэр, на савецкія пралетарскія сродкі ўскормлены і ўспоены на грудзях пралетарскай рэвалюцыі, зьмянным дзялам прабуе ўпіцца ў самае сэрца гэтай рэвалюцыі. Катляроўскі тут гаварыў, што ён улазіў у генэратар болт і выклікаў аварыю. Добра, што гэта аварыя не пацягнула за сабой такіх вынікаў, якія яна насіла магла пацягнуць. Але хіба гэта быў адзін-адзіны выпадак і хіба там не знаходзілася другія рабочыя болты ў такіх мясцох, дзе ім ніяк не належала знаходзіцца. Мы гэта ўстановілі тут на судовым сьледзтве. Казачкі, дошак, камякоў, лейкая пітушка для абмятаньня ў нетрах нашых машын.

Мы маем таксама на Зуеўцы рад аварый, якія здарыліся з турбінамі № 1-3, з масьлянымі помпамі.

На падставе ўсіх матар'ялаў, якія прайшлі перад намі на гэтым судовым сьледзтве, мы можам проста сказаць, што гэта ня толькі яўна нядобразгаканыя адносіны да справы асоб, праведзіўшых мантаж, а тое, што мы характарызуем зноў-такі як наўмысную шкод нашкоду дзяржаўнасьці.

**Іванаўская электрастанцыя — Іодрэс.** На працягу часу са студзеня 1932 г. па дзень узбуджэньня расьсьледаваньня

вельмі тонка, пад відам некаторага роду пераабсталяваньня, — такгама свайго роду рацыяналізацыі, аб якой тут гаварыў падсудны Гусеў, — разбураюць фундамант, а потым пачынаюць рамонт вуцілятарачы, выводзячы яе са строю і пакідаючы станцыю ў такім стане, які на іх шкодніцкай мове атрымаў спецыяльна тэхнічную фармулу — «аварыйны стан станцыі».

Мы маем, нарэшце, затрыманьне ў пераабсталяваньні катлоў № 1, 2 і 11, што прывяло станцыю ў такое становішча, калі яна падчас была мець і мела ў сапраўднасьці тонны пашкоджаную магутнасьць, і пашкоджаную вельмі значна, прыкладна, напалову — з 12.000 кілёват нармальнай магутнасьці магла разьвіць ледзь толькі 6.000 кілёват. Вы памятаеце, так, судзьдзі, як гэтыя аварыі рабіліся. Нельга сказаць, каб яны рабіліся ўжо вельмі складаным спосабам. Наадварот, як паказваў тут ужо Гусеў, аварыі з моторам у 1.400 кзн. сіл была выклікана вельмі лёгкім шляхам — увядзеньнем у мяжкалежны прастор паміж статарам і ротарам рабочага металёвага прадмету.

Аналізуючы прычыны гэтых аварый, і ў прыватнасьці і важней за ўсё аварыі 10 красавіка, мы бачым, што цэлы рад другіх аварый з тым-жа матором, аб якім я гаварыў зараз, — аварыі 12 і 13 чэрвеня і іншыя,—зьяўляліся простым рэзультатам надобразгаканага, нядобраумыленнага зьмянчэньня прычын першай аварыі, сьвядомага і наўмыснага дрэннага рамонту пасьля першай аварыі. Аналізуючы прычыны гэтай аварыі, экспэртная камісія прыйшла да заключэньня, што зьмянчэньне статарнага жалеза мала адбіцца а-за трапляньня ў мяжкалежны прастор рабочага металёвага прадмету і што ў нармальных экспляатацыйных умовах рабочае жалеза не магло трапіць у матор і можа быць упісчнута туды толькі штучна.

Але тады, калі экспэртная камісія знаходзіла гэтыя даныя, апіраючыся на аварыйны акт, яна, вядома, ня мела на ўвазе пазнаньняў Гусева, якія прайшлі тут перад судом, у якім Гусеў расказаў сам, як у сапраўднасьці гэта рабочае жалеза трапіла ў матор, як яно было туды ўкладзена сьвядома, нецымсна, у выніку шкодніцкіх намаў, на аснове якіх разгарталася ўся дзейнасьць Гусева ў гэты перыяд.

Зімой 1932 году на Златаустаўскай электрастанцыі здарылася новая аварыя з катлом № 8, які стаіць у галодным рэзэрве. І гэта аварыя была зроблена наўмысна і, як выявілася, ня бог ведае якім мудрым спосабам — ня

## VI. АБВІНАВАЧАНЫЯ І ІХ ЗЛАЧЫННАЯ ДЗЕЙНАСЬЦЬ

Дазвольце перайсьці да характарыстыкі злачынстваў, роді і адказнасьці пасобных злачынцаў. Мы маем перад сабой такі факт, як уласнае прызнаньне раду людзей. Гэта магло-б аслабаніць у іншых выпадках наогул ад расьсьледваньня якіх-бы там ні было іншых доказаў. Мы ведаем, што па працэсуальнаму праву і ў нашым праве, бо не заўсёды пры наяўнасьці прызнаньня абвінавачанага зьяўляецца неабходнасьць праверкі ўсіх аналічнасьцяй справы ў метах праверкі правільнасьці гэтага ці іншага. Але ў буржуазным праве гэты прынцып невыладковы. У буржуазных краінах дагэтуль пакуе старое сярэдзявяковае прадстаўленьне аб значэньні і якасьці доказаў, сярод якіх асабістае прызнаньне абвінавачанага лічылася лепшым, лічылася «царыцай усіх доказаў».

Але трэба падкрэсьліць, тав. судзьдзі, што ў гэтым працэсе, які мае вялізарнейшае значэньне, побач з прызнаньнем самих абвінавачаных мы маем цалую суму аб'ектыўных доказаў, супроць якіх ня можуць устоюць ніякія варожыя нам сілы. Такім чынам, у нас ёсьць у руках усе гэтыя аб'ектыўныя матар'ялы, якія гаворыць аб тым, што нават пры самым палкім выбраўжэньні нельга выдумаць таго, што ў сапраўднасьці мела месца, што зафіксавана, адлюстравана і ў актах, і фатаграфіямі, і нават у хронасьлайдах фарме тых з абвінавачаных, якія прабуюць наогул апагаціць усё тое, на што мы спасылаемся, на што яшчэ раз спасылаемся яны самі, як на меўшыя месца прадзяўшыя і бязумоўна ўстаноўленыя факты.

Я хацеў прасіць спецыяльнае прысуцтва Вярхоўнага суда, калі яно будзе абмяркоўваць прыгавор, зьвярнуць увагу іменна на гэты бок справы і яшчэ раз праглядзець, хоць-бы для гэтай мэты з пункту гледжаньня ацэнкі пасьлядоўнасьці абвінавачаньня ў гэтым пытаньні, прадстаўленае намі Вярхоўнаму суду нашага абвінавачаньня заключэньне, дзе мы ў аснову кладзем экспэртызу, дзе мы кладзем у аснову нашых абвінавачаньняў цьвёрда ўстаноўленыя факты, дзе мы ў аснову кладзем матар'ялы з пункту гледжаньня тэхнікі, з пункту гледжаньня тэхнічнай экспэртызы, тыя самыя факты, з аналізу якіх мы прыходзім да ацэнкі аб'ектыўных паказаньняў і суб'ектыўных прызнаньняў.

Цяжар нашых доказаў вельмі вялікі, цяжар гэтых доказаў апіраецца на вялізарную работу, праведзеную ў працэсе папярэдняга сьледзтва, у нячуваным па прыкрасьці тэрміны. Гэта тэхнічная праверка тых актаў, тых фактаў, на падставе якіх быў узьведзен і — я зараз магу са адзначаньнем сказаць,— мощна стаіць наш будынак дзяржаўнага абвінавачаньня.

**ГУСЕЎ** — начальнік Златаустаўскай электрастанцыі, два гады служыў у армі Калчака, контр-рэвалюцыянэр, разьведчык, шпіён, школнік, псуе матор буйна-гатунковаго стану пракаатнага цэху з мэтай прыпыніць выпуск апаратаў і снарадных загатовак. Гусеў зьбірае сакрэтныя ваенныя весткі, стараніна вы кожнае шпіёнскія абавязкі і матар'ялы перадае Тарнтону, псуе машыны, арганізуе дывэрсыйныя акты, якія накіраваны на тое, каб нанесьці ўдар нашай абароназдольнасьці.

Я ня буду ўтойваць перад судом сваё ўяўленьне аб Гусеве, як аб адной з галоўных фігур у гэтай контр-рэвалюцыйнай змове у электрапрамысловасьці. Я ў адносінах да Гусева павінен патрабаваць найбольш суровага пакаранньня, чым у адносінах якога-небудзь іншага абвінавачанага, выходзячы з гэтай яго ролі, характару яго злачынстваў, а таксама выходзячы з тых агульных прынцыповых меркаваньняў, якія вынікаюць сутнасьць і напрамак нашай савецкай крымінальнай палітыкі, аб якой я ўчора гаварыў даволі доўга для таго, каб сёньня да гэтага пытаньня не вяртацца і, у прыватнасьці, апіраючыся на вядомую вам, таварышы судзьдзі, пастанову прэзыдыюму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў ад 14 сакавіка г. г.

**СОКАЛАЎ** — кацтаковец — прасоўваецца Гусевым на пасаду галоўнага электрыка сілавой станцыі, як суўдзель яго ў шкодніцкай работе. Сокалаў, як і Гусеў прызнаў сябе вінаватым. Ён таксама зьбірае і перадае весткі шпіёнскага характару, якія асабліва цікавяць ваенных разьведчыкаў.

Трэцяя фігура Златаустаўскай школ

на ўскладненьне міжнародных адносін, у перспэктыве на падрыхтоўку вайны супроць Савецкага саюзу.

**АЛЕЙНІК** — служачы фірмы «Мэтра-Вікерс», працаваў пад кіраўніцтвам Маркгаўза і Тарнтона, якія вельмі многа клапаціліся аб яго лёсе, якім вельмі многа давалі яму, як свайму вернаму агенту. Тарнтон дапамог яму адкрыць бягучы рахунак у ангельскім банку і рэбіў рэгулярныя штомесячныя аднічэньні на яго рахунак у Англіі. Гэты верны агент прабраўся, расказаў суду і паказаў сваю шкодніцкую работу, якую выконваў па указаньнях Тарнтона і Маркгаўза.

**КУШНІ** працаваў у Баку. З 1928 г. пачынаецца дзейнасьць Кушні. Макдональд паказаў, што Тарнтон, Маркгаўз і Кушні зьяўляюцца асноўнай групай разьведчыкаў, якія пад шыльдай фірмы «Мэтра-Вікерс» займаліся шпіёнскай дзейнасьцю ў СССР. Прыцёрты да сьцяны Кушні відзе сябе як вопытны разьведчык: прызнаўшы правільнасьць прад'яўленага яму абвінавачаньня ў шпіёнскай дзейнасьці, ён у далейшым упарта адмаўляецца даваць якія-б там ні было паказаньні. Але гэта не ратуе Кушні, бо ложны крок, які ён робіць, ён робіць па тонкім пруту ці ілжы. І ён ловіцца, ён выкрыт, як выкрыты вось гэтыя паны: Тарнтон, Маркгаўз, Нордвол, Гусеў, Сухаручкін і інш. Маркгаўз гаворыць, што Кушні займаўся шпіёнскай работай і што шпіёнскую інфармацыю ён атрымліваў ад Тарнтона і Кушні. Алейнік пацьвярджае, Маркгаўз пацьвярджае, Тарнтон пацьвярджае і, нарэшце, сам Кушні гэта пацьвярджае. Але потым схамянуўся і заявіў: «Больш нічога не скажу»...

Не скажаце? Ня трэба. Кола ўлік замкнулася і няма выхаду з гэтага кола.

**КУТУЗАВА.** — Тут справа стаіць яшчэ больш проста. Яна адрадзіла інтарэсам сваёй краіны за грошы і таму павінна таксама адказваць за гэта даволі сур'ёзна. Але Кутузава мае некаторыя плюсы, хоць і апрыманыя ёю з вялікім спазьненьнем. Яна дала шчырыя і чыстасардэчныя тлумачэньні. Яна не папкадавала сябе, не папкадавала і сваіх суўдзельнікаў. Яна расказала, можа быць ня ўсё, што яна ведала, нават напэўна ня ўсё, але і таго, што яна сказала, з вартай, мне здаецца, прастатой і шчырасьцю, характарызуючы і сваю ўласную злачынную «працу», аналягічную працу сваіх суўдзельнікаў, усяго гэтага даволі, каб улічыць гэта пры канчатковым вырашэньні пытаньня аб лёсе Кутузавай.

**МАНКГАУЗ.** — Ён пражыў у СССР звыш 20 год. Абвінавачаньне лічыць даказаным, што Маркгаўз зьбіраў праз ранд сваіх падначаленых ангельскіх інжынэраў, а таксама некаторых рускіх інжынэраў секрэтныя весткі ваенна-дзяржаўнага значэньня, што ён прымаў удзел у шкодніцкай дывэрсыйнай работе пакаянай контр-рэвалюцыйнай групы, што ён за гэту шпіёнскую, дывэрсыйную, шкодніцкую работу плаціў сыстэматычна розныя грашовыя сумы, давяў хабары рускім інжынэрам за ўтойваньне імі дэфэктаў, якія мелісь ў абсталяваньні, што пастаўлялася фірмай «Мэтра-Вікерс» і ня служачых фірмы «Мэтра-Вікерс», але працуючых у сувязі з імі. Ён прызнаў дачу хабару рускім інжынэрам і тэхнікам за шпіянаж праз пасобных інжынэраў і тэхнікаў, служачых гэтай фірмы і непасрэдна. Ён прызнаў дачу хабару за сьвядомае ўтойваньне дэфэктаў абсталяваньня. Так было на папярэднім сьледзтве. На судовым сьледзтве Тарнтон, як вы памятаеце, адмовіўся ад таго, што ён прызнаваў на папярэднім сьледзтве, за выключэньнем зьбіраньня эканамічнай інфармацыі, якая не складае крымінальна-караемага злачынства.

Ну, як, п-не Тарнтон, у вас стаіць справа з ваенным шпіянажам? Няважна для вас, няважна. Вы падбіраеце спэцыяльных людзей. Вось яны: Гусеў, які сядзіць за вашай сьпіной, Лабанаў — гэта былыя беларвардзейскія афіцэры. Вось ваша сетачка, ваша дывэрсыйная група! Потым гэты ваш дакумант ад 13 сакавіка, ад якога вы так старанна адмяжоўваецеся. Калі, таварышы судзьдзі, мы заводзім гутарку аб гэтым дакумэнце, Тарнтон працінь рэшту самаўладзьцьня, ён усказвае, як мы бачылі гэта ня раз, і гаворыць: «Я поўнасьцю адмаўляю». Ён адмаўляе з 10 дакумэнтаў іменна гэты дакумант, а не дакумант 12 сакавіка — да гэтага; ні допыт 14 сакавіка — пасьля гэтага, ні 20, ні 1 красавіка — ні адзін з пратаколаў гэтых дзён так не хвалюе Тарнтона, як іменна гэты дакумант. Бязумоўна — трэба сказаць, што гэты дакумант мы павінны пакінуць на сумленьні Тарнтона — гэта яго дакумант. Гэтым дакумантам ён ня толькі раскрывае сваю сетку гэтых 15 разьведчыкаў, якія былі заняты эканамічным і палітычным шпіянажам і 12 разьведчыкаў, якія былі заняты ваенным шпіянажам, ён выкрывае, што кіраўніцтва гэтай шпіёнскай арганізацыяй на тэрыторыі СССР ажыцьцяўлялася брытанскай разьведчай установай пад назвай «Інтэлідженс Сэрвіс», пры яе агента Рычардса, які займае пост дырэктара-распарадчыка фірмы «Мэтра-Вікерс».

Ён указаў, між іншым, у гэт

# ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ ПРЫГАВОРЫ ПА СПРАВЕ ШКОДНІКАЎ

## Настрой ангельскага друку

**ЛЁНДАН, 19.** Прыгавор па маскоўскім працэсе чакаўся ў Лёндане з вялікай нецярплівасьцю і друкуецца сёньня газэтамі, як важнейшая падзея дня. Прыгавор у адносінах да падсудных ангельцаў аказаўся больш лёгкім, чым яны чакалі. За апошнія дні ангельскі друк прадракаў куды больш суровыя прыгаворы, лічачы, што ўсе абвінавачаныя ангельцы, за выключэньнем Грэгоры, будуць прысуджаны да шматгадовага турэмнага зьняволеньня. Лёндансікі карэспандэнт «**Манчэстэр Гардыян**» піша, што некаторыя колы будуць вітаць прыгавор, як доказ правільнасьці іх пункту гледжаньня, згодна якога працэсу наогул ня было-б, калі-б ангельская дыпляматыя не пазбавіла савецкі ўрад магчымасьці спыніць справу пасьля таго, як ангельцы былі арыштаваны. Па словах карэспандэнта, усе чакалі куды больш суровага прыгавору, але ў той-жа час думалі, што ўсім ангельцам прыгавор будзе заменен высылкай.

У якасьці апошняга сродку зганьбіць маскоўскі працэс, ангельская прэса зварочваецца да цьверджаньня, быццам абаронцы баяліся як належыць абараняць сваіх кліентаў, палохаючыся рэпрэсій з боку ДПУ. Гэта мысль падкрэсьліваецца ў загалоўках паведамленьняў, нават у тых выпадках, калі сам тэкст паведамленьняў не зьмяшчае нічога, што-б пацьвярджала яе. Так, напрыклад, «**Стар**» ва ўчарайшым нумары даў загаловак над паведамленьнем аб прамовах абароны: «Абаронцы тэрарызаваны ДПУ», у той час, як у самым паведамленьні абарона кваліфікавалася, як «бліскучая».

Узорам таго, у якой ступені нават інтэлігентныя колы ангельскага грамадзтва былі ўведзены ў зман спробамі дыскрэдытаваць савецкі суд, зьяўляецца карэспандэнцыя з Масквы вядомага ангельскага журналіста **Кенігса**, які прадстаўляе ў Маскве лібэральную газэту «**Н'юс Кронікль**». Гэты карэспандэнт піша: «Я павінен прызнацца, што ў Англіі мне ўнушалася думка аб тым, што абарона рускіх адвакатаў зьяўляецца нерэальнай. Але я павінен адкрыта прызнаць іх бесстаронную вопытнасьць і таленавітую сьмеласьць, з якою яны аналізавалі даныя сьледзтва і высоўвалі свае аргументы».

Учора той-жа карэспандэнт пісаў: «Адсутнасьць станоўчых даных для абароны зьдзіўляючая. Калі-б ангельскі ўрад прысьвяціў арганізацыі абароны хоць-бы дзесятую частку тэй энэргіі, якую ён ужыў на выпрацоўку закону аб эмбарго, дык вынікі былі-б больш спрыяючыя для абвінавачаных».

Выдатны карыкатурыст газэты «**Івінг Стандарт**» **Лоу** скарыстаў гэту тэму для карыкатуры, якая малюе Саймона быццам ён катаецца на канькох з надпісам «эмбарго» ўзад і ўперад перад будынкам маскоўскага суда ў суправаджэньні натоўпу хворых на «хранічнае русафабства», якія робяць недарэчны шум.

Тое, што цьверджаньне аб невінаватасьці ангельцаў ужо даўно моцна пахіснулася, пацьвярджаецца тым, што некалькі дзён таму назад ангельскі ўрад сам інсьпіраваў паведамленьні ў ангельскіх газэтах быццам ён ніколі ня лічыў арыштаў зусім бязгрунтоўнымі, а толькі клапаціўся аб тым, каб суд быў справядлівым.

## Трывога сярод брытанскіх гандляроў

**ЛЁНДАН, 20 (Белта).** Кансэрватыўны друк прабуе даказаць, што эмбарго на імпарт з СССР прыняце шкоду галоўным чынам СССР. Аднак, шмат якія аглядальнікі падкрэсьліваюць цяжкія вынікі, якія пацягне за сабой эмбарго для брытанскага гандлю. Нават фінансавы аглядальнік «**Морнінг Пост**» адзначае вострую трывогу сярод брытанскіх гандляроў лесам у сувязі з магчымасьцю неданушчэньня савецкага лесу.

Фінансавы аглядальнік «**Н'юс Кронікль**» падкрэсьлівае, што эмбарго на савецкі лес будзе азначаць толькі тое, што шведзкія і фінляндзкія лесапрамысловцы паб'юць сабе кішэні за кошт брытанскіх рабочых, якія да гэтага часу шырока карысталіся савецкім лесам для будаўнічых работ.

«**Манчэстэр Гардыян**» публікуе заяву манчэстэрскага муніцыпальнага будаўнічага экспэрта, які ўказвае, што эмбарго на савецкі лес неадкладна пацягне за сабой падаражэньне будаўніцтва. «Манчэстэр Гардыян» прыводзіць таксама ўказаньне выдатнага гандляра бавоўнаю, што прадзільным прадпрыемствам цяжка будзе знайсьці той гатунак бавоўны, які мог-бы замяніць савецкую бавоўну. Шмат якія прадзільныя прадпрыемствы высока цэняць савецкую бавоўну і вельмі зацікаўлены ў тым, каб карыстацца ёю ў далейшым.

«**Фанэншызл Таймс**» указвае, што тэкстыльныя фабрыканты Ланкашыру адзначаюць высокую якасьць і нізкі кошт савецкай бавоўны і чакаюць, што ў выніку эмбарго будуць узьняты цэны.

*

**БЭРЛІН, 20 (Белта).** «**Кельнішэ цэйтунг**» указвае, што маскоўскі працэс ня прычына, а толькі повад для налажэньня эмбарго на ўвоз пэўных тавараў з СССР. Прычынай-жа зьяўляецца Отаўская згода. Канадзкія гандляры лесам, а таксама прадстаўнікі іншых галін гандлю імкнуцца перашкодзіць увозу савецкіх тавараў у брытанскую імпэрыю. Ангельскі ўрад прыцьпынова на баку гэтых гандлёвых колаў і таму маскоўскі прыгавор аказаўся напэўна прыстойным повадам для правядзеньня гандлёвых абмежаваньняў у адносінах СССР.

## ПОЛЬШЧА СЕНЬНЯ...

*(З быту беспрацоўных)*

**НА ЗДЫМКУ: Беспрацоўны ў пошуках пажывы ў адной з урнаў варшаўскай вуліцы.**

## „Абвінавачаньне ангельскіх інжынэраў у шпіянажы—абгрунтаванае"

**АМСТЭРДАМ, 19. (БЕЛТА).** Уплывовая буржуазная газэта «**Н'юве Ротэрдамшы Курант**», якая выходзіць у Ротэрдаме, у сваім міжнародным агляде падрабязна камэнтуе маскоўскі працэс шкоднікаў. Газэта адносіцца надзвычай адмоўна да пазыцыі Англіі ў адносінах працэсу. «Зусім зразумела,—піша газэта,—што брытанскае міністэрства замежных спраў прабавала на магчымасьці аблягчыць лёс сваіх грамадзян, але ангельскі ўрад патрабаваў няправільнага суда, а таго, каб супроць ангельскіх інжынэраў наогул ня было ўзьнята судовага сьледзтва». Па думцы газэты, паводзіны ангельскага ўраду ў гэтай справе былі «няпрыстойнымі», што ён тым самым значна пашкодзіў падсудным.

«Абвінавачаньне ангельскіх інжынэраў у эканамічным і ваенным шпіянажы,—піша газэта,—тым больш абгрунтаванае з прычыны агульна-вядомага спрыту брытанскай сакрэтнай службы». Газэта падкрэсьлівае, што цьверджаньне ангельскага друку аб «трэцяй ступені» ў часе суда поўнасьцю правалілася. «Наперакор ангельскай палітыцы шпігананьня,—піша газэта ў заключэньне,—Савецкі саюз імкнуўся ўнікнуць канфлікту, але Лёндан тым ня менш хоча прыму сіць СССР вызваліць асуджаных інжынэраў, ня гледзячы на тое, што прыгавор нясуровы і фармальна ня можа дыскусавацца».

# Паведамленьне ТАСС

13 красавіка 1933 г. дыпляматычны агент манчжурскага ўраду ў Харбіне Шы-Люй-Бень перадаў генэральнаму консулу СССР у Харбіне тав. Славуцкаму ліст, у якім ён зварачаецца да пытаньня аб пераходзе з КУЧ на савецкія чыгункі некаторай колькасьці паравозаў сэрыі «Е» (дэкаподаў), купленых у свой час для дарог СССР і пакінутых на КУЧ у годы інтэрвэнцыі.

У сваім лісьце дыпляматычны агент апратэстоўвае вычарпальнае растлумачэньне тав. Славуцкага ў яго лісьце ад 12 верасьня мінулага году аб тым, што гэтыя паравозы належаць дарогам СССР, на тэй падставе, што нібыта няма дакумантаў аб належнасьці ўказаных паравозаў савецкім дарогам.

Прызнаючы, што гэтыя паравозы сапраўды ня лічацца ў інвэнтары КУЧ, прадстаўнік Манчжурскага ўраду ўсё-ж сьцьвярджае, што паравозы стаялі часткай маемасьці КУЧ, паколькі да апошняга часу ня было ніякіх спрэчак па пытаньні аб праве ўласнасьці на гэтыя паравозы.

На падставе вышэйпрыведзенага, дыпляматычны агент просіць вярнуць на КУЧ паравозы, якія перайшлі на савецкую тэрыторыю, і заплаціць дарозе грошы, нібыта належачыя за карыстаньне гэтымі паравозамі.

18 красавіка гэтага году генэральны консул СССР у Харбіне тав. Славуцкі адправіў дыпляматычнаму агенту Шы-Люй-Бень адказ, у якім гаворыцца:

«У сваім лісьце ад 12 верасьня я ўжо растлумачыў вам, што паравозы, аб якіх вы падняли пытаньне, належаць СССР і што гэты бясспрэчны і дакумантальна ўгрунтаваны факт вядомы праўленьню КУЧ і што ня можа быць сумненьня наконт права саюзнага ўраду распараджацца гэтымі паравозамі.

Вось чаму я вельмі зьдзіўлен тэй акалічнасьцю, што вы пасьля такіх ясных і вычарпальных растлумачэньняў, даных вам у верасьні мінулага году, нечакана зноў вярнуліся да гэтага пытаньня і прабуеце пярэчыць супроць прыналежнасьці гэтых паравозаў СССР, цьвердзячы, што няма ніякіх дакумантаў аб гэтым. Я вымушан таму даць вам некаторыя дадатковыя весткі, якія добра вядомы праўленьню КУЧ і ня могуць быць невядомы ўладам Манчжоу-Го. Паравозы сэрыі «Е» (дэкаподы) ў колькасьці 124—8 складаюць частку вялікай партыі паравозаў гэтага тыпу, купленых расійскім урадам у Амэрыцы для чыгунак СССР. Гэтыя паравозы паступалі морам праз Уладывастоцкі порт і зьбіраліся ва ўладывастоцкіх і харбінскіх чыгуначных майстэрнях, пераходзячы ў далейшым на савецкія дарогі.

З прычыны ваеннай інтэрвэнцыі на Далёкім Усходзе супроць СССР у 1918-19 г. г. частка гэтых паравозаў у колькасьці 124—8 застрала па дарозе ў СССР на КУЧ.

У справах праўленьня дарогі існуюць неабвержныя дакумантальныя доказы, якія сьцьвярджаюць, што ў 1918 годзе на КУЧ было такім чынам затрымана 38 паравозаў, у 1919—33 паравозы, у 1920—36 паравозаў, у 1921—17 паравозаў. Усяго такім чынам на КУЧ затрыманы былі 124 паравозы сэрыі «Е».

Факт належнасьці СССР указаных паравозаў ня раз адзначаўся, як бясспрэчны, цэлым радам пастаноў праўленьня дарогі і рэвізійнага камітэту савету кіраўніцтва і г. д. Спасыланьні на гэта ёсьць у афіцыяльных пратаколах праўленьня КУЧ за №№ 115 ад 1919 году, 361—1919 г., 597 і 760—1920 г., 947—1921 г., 1755—1922 г. і 3951 ад 1927 г.

У зацьверджанай рэвізійным камітэтам праўленьня дарогі эксплёатацыйнай справаздачы КУЧ за 1922 год ёсьць спэцыяльная агаворка: «124 паравозы—дэкаподы—належаць расійскім чыгункам».

Пры разглядзе справаздачы за 1924 год па журналу савету кіраўніцтва дарогі ад 2 ліпеня 1925 году за № 478 адзначалася: «Праўленьне дарогі... павінна адзначыць, што і тэхнічныя, і фінансавыя розультаты эксплёатацыі дарогі ў значнай ступені павінны быць аднесены за кошт расійскага ўраду, рухомым саставам якога працуе дарога, не адзначаючы ні ў каштарысах, ні ў справаздачах свайго доўгу за карыстаньне саставам».

Спадзяюся, што прыведзеных мной дакумантальных даных зусім даволі для таго, каб не варочацца больш да пытаньня аб прыналежнасьці гэтых паравозаў.

Што датычыць пытаньня аб разьліках за карыстаньне КУЧ паравозамі сэрыі «Е», дык савецкі ўрад сапраўды лічыць вялікую запазычанасьць за КУЧ, якая карысталася дармова на працягу многіх год гэтымі паравозамі СССР, і намеран паставіць гэта пытаньне перад КУЧ у адпаведны момант.

У перапісцы старшыні праўленьня КУЧ п. Лі Шоу-гена з намесьнікам старшыні КУЧ Кузьняцовым ёсьць дакоры ў затрыманьні вагонаў КУЧ дарогамі СССР. Я лічу неабходным па гэтым пытаньні заявіць, што паміж КУЧ і савецкімі дарогамі адбываецца заўсёды абмен вагонамі і ня дзіва, што пэўная колькасьць вагонаў КУЧ знаходзіцца на тэрыторыі СССР, таксама як такая-ж і нават большая колькасьць вагонаў, у даным выпадку больш за 2.000 вагонаў савецкіх чыгунак, знаходзіцца на КУЧ. Калі зварот вагонаў з СССР на КУЧ часам і затрымліваўся, дык адбывалася гэта з прычыны ваенных дзеяньняў паміж кітайскімі атрадамі і японска-манчжурскай арміяй, што на працягу многіх месяцаў закупорыла КУЧ з абодвух канцоў—усходняга і заходняга.

У заключэньне лічу неабходным па помніць, што, як ужо ўказвалася мною ў пісьме лісьце ад 12 верасьня, савецкія прадстаўнікі на КУЧ дакладна кіруюцца ўказаньнямі ўраду СССР аб суровым захаваньні і пільнім выкананьні пэкінскага і мукденскага дагавораў і неабходнасьці ўрэгуляваньня ўсіх узьнікаючых пытаньняў у парадку, прадугледжаным гэтымі дагаварамі. Таму я спадзяюся, што манчжурскія ўлады, кіруючыся тымі самымі пастановамі, ня будуць у далейшым рабіць перашкод нармальнай дзейнасьці КУЧ».

## Паведамленьні

— Сёньня, 21 красавіка, роўна ў 7 гадз. веч., у памяшканьні Дому Камасьветы (вул. Карла Маркса) адбудзецца кансультацыя для выкладчыкаў, вылучаных гаркомам КП(б)Б да першамайскіх сьвят.

**Менгарком КП(б)Б.**

— 22 красавіка, у 7 гадз. вечара, у залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б (рог Чырвонаармейскай і Карла Маркса, будынак ЦК, 3-ці паверх) адбудзецца нарада загадчыкаў аддзелаў кадраў (камуністаў) наркаматаў і цэнтральных устаноў.

**Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б.**

# АБ ХОДЗЕ ПАДРЫХТОЎКІ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

## ПАСТАНОВА СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы па аднаасобным сэктары ідзе зусім нездавальняюча. Па даных 69 раёнаў на 5 красавіка па адна асобных гаспадарках лічыцца ссыпанага насеньня па выдадзеных імі расьпісках: па збожжавых на 61,4 проц. (у тым ліку аўса 61,4 проц.), па ільну — 74 проц., па бульбе — 66,3 проц. Ссыпка страхавых фондаў ня скончана (па збожжавых 76,4 проц., па ільну — 73,4 проц., па капоплях — 47,1 проц., па бульбе — 20 проц.). Ачышчана насеньня збожжавых культур усяго толькі 21,5 проц., ільну — 16,9 проц. Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару ня скончан. Аб становішчы цягавай сілы ў аднаасобнікаў вестак у НК Зямляробства зусім няма.

Усё гэта сьведчыць аб яўнай недацэнцы з боку зямельных органаў і РВК аднаасобнага сэктару ў пасеўнай кампаніі бягучага году, які складае па пасеўнай плошчы да 48 проц., у выніку чаго ня было належнага кіраўніцтва падрыхтоўкай аднаасобнікаў да веснавой сяўбы як з боку НК Зямляробства, так і раённых выканаўчых камітэтаў. Пры давядзеньні плянаў сяўбы да паасобных гаспадарак, пры атрыманьні насенных расьпісак і пры праверцы фактычнай наяўнасьці былі: выпадкі сухога адміністрацыйнага нажыму замест правільна пастаўленай раслумачальнай грамадзкай работы.

Савет Народных Камісараў пастанаўляе:

1. Прыняць да ведама заяву тав. Рачыцкага, што зараз улік насенных фондаў аднаасобных гаспадарак ужо наладжан. Загадчыкам зямельных аддзелаў Бешанковіцкага тав. **Гараўцу**, Дзяржынскага тав. **Забалотцу**, Крычаўскага пав. **Калнасу**, Буда-Кашалёўскага тав. **Завадзкаму**, Нараўлянскага—т. **Вайцаховічу**, Камарынскага тав. **Кастраме**, якія да сёньняшняга дня ня далі вестак аб забесьпячэньні аднаасобных гаспадарак насеньнем — абвясьціць вымову.

2. Абавязаць НК Зямляробства пад асабістую адказнасьць тав. **Равінскага**, і раённыя выканаўчыя камітэты пад асабістую адказнасьць старшынь:

а) скарыстаць дні, якія засталіся да пачатку масавай сяўбы, для скончаньня аднаасобнымі гаспадаркамі ўсіх падрыхтоўчых мерапрыемстваў да сяўбы;

б) арганізаваць праверку давядзеньня пасеўных плянаў да аднаасобных гаспадарак і дабіцца выкананьня ўсіх аграмерапрыемстваў, зьвязаных з павышэньнем ураджайнасьці;

в) неадкладна давесьці абавязковыя ўгрупраўлы да кожнай аднаасобнай гаспадаркі і за невыкананьне іх прыцягваць вінаватых да адказнасьці;

г) кожнаму саўгасу і калгасу паставіць, як абавязак, аказаньне максымальнай дапамогі аднаасобным гаспадаркам у правядзеньні веснавой сяўбы (ачыстка насеньня, пратручваньне, дапамога інвэнтаром і інш.) і гэтым садзейнічаць уцягненьню аднаасобнікаў у калгас;

д) устанавіць па аднаасобным сэктары справаздачнасьць па ўсіх мерапрыемствах і ў тым-ж тэрміны, як для калгасаў і саўгасаў.

3. Абавязаць РВК і сельсаветы шырока распачаць растлумачальную работу па папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду аб загатоўках і здачы дзяржаве сельска-гаспадарчай прадукцыі, памятаючы, што ад посьпехаў гэтай працы і ад наладжаньня канкрэтнага кіраўніцтва з боку РВК і сельсаветаў пасеўная кампанія ва ўсіх сэктарох будзе залежыць і поўнае правядзеньне пасеўнай кампаніі ў аднаасобным сэктары.

**Старшыня СНК БССР**
**М. ГАЛАДЗЕД.**
**Кіраўнік справаў СНК БССР**
**С. КАНДЫБОВІЧ.**

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.


## ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

*СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ*

ПРАСПЭКТ. (Красавік 1933 г.)
**Выражце і захавайце!**

# ПАДРУЧНІКІ і навуч. ДАПАМОЖНІКІ

## ДЛЯ СЯРЭДНЯЙ І ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

**(рабфакаў, тэхнікумаў, для інстытутаў і інш. ВНУ і ВТНУ)**

## ВЫШЛІ з ДРУКУ і ёсьць у ПРОДАЖЫ:

### МАТЭМАТЫКА

ГАЙГАРАДАЎ А. (праф.). — Чацырохзначныя табліцы лёгарыфмаў, антылёгарыфмаў, натуральных трыгонометрычных вялічынь і іх лёгарыфмаў, пераводу градусаў у радыяны, квадратовых корняў, адваротных вялічынь, паказальнікавых і гіпэрболічных функцый. Стар. 64. 1932 г. ц. 1 руб. 35 к. пер. 15 к. *).

КАРАТКОЎ К. — Колькасны аналіз. Падручнік для практычных заняткаў. Стар. 62. 1930 г., ц. 40 к.

МРОЧАК В. (праф.). — Тэхнічная матэматыка. Зборнік правіл, формул, прак тычных заданьняў і задач. Стар. 304. 1930 г. ц. 30 к.

ПЯТЭЦКІ П. (праф.). — Зборнік матэматычных формул па ўсім курсе элямантарнай і вышэйшай матэматыкі. (Ухвалена ДВС у якасьці дапамоснікa для студэнтаў). (Выд. II спэрыатычнае). (ДНТВБ). Стар 52. 1933 г. ц. 60 к.

ПЯТЭЦКІ П. (праф.). Спрэвачнік па матэматыцы. Стар. 128. 1932 г. ц. 70 к.

ШАБУНЯ А. — Нарысная геомэтрыя. Стар. 198. 1931 г. ц. 1 руб. 50 к. пер. 25 к.

ШАБУНЯ А. — Атлас рысункаў па нарысной геомэтрыі. 95 табліц. 1932 г. ц. 2 руб. 50 к., пер. 50 к.

### БІОЛЁГІЯ

МАЎРАДЗІАДЭІ П. (праф.). — Біолёгія. Рабочая кніга, ч. I. Асновы агульнай біолёгіі. Стар. 244. 1930 г., ц. 2 руб.*)

### ЗООЛЁГІЯ

НАТАЛІ В. — Зоолёгія для пэдтэхнікумаў. Стар. 416. 1930 г. ц. 3 руб.

### ХЭМІЯ. ФІЗЫКА.

МАРХІЛЕВІЧ К. і ЧЫБІСАЎ К. — Арганічная хэмія. Стар. 168. 1932 г. ц. 1 руб. 25 к. *).

МІХАЙЛАЎ М. — Якасны хэмічны аналіз. Стар. 112. 1931 г. ц. 1 руб. 25 к.

ПАЎЛАЎ Б. і СЯМЕНЧАНКА В. — Неарганічная хэмія. Стар. 348. 1932 г. ц. 2 руб. 25 к. пер. 25 к.

ПЯРОЎСКІ П. — Хэмічны практыкум. Дапамоснік пры працяжэньні курсу неарганічнай хэміі. Стар. 78. 1932 г. ц. 55 к. пер. 25.

ТОМСОН Г. (праф.).—Атом. (НКЛП — ДНТВБ. — Сэктар падручнікаў і навучовай кнігі). Стар. 102. 1933 г. ц. 1 руб. 20 кап.

ШАЛАЎРАЎ Н.— Рабочая кніга па фізыцы для пэдтэхнікумаў. Стар. 436. 1931 г. ц. 4 руб. пер. 35 к. *)

### МЭТОДЫКА ФІЗЫКІ

ШАЛАЎРАЎ Н. — Мэтодыка фізыкі, ч. I. Агульныя праблемы арганізацыі заняткаў па фізыцы ў школе. Дапамоснік для студэнтаў пэдфакаў і пэдінстытутаў і для выкладчыкаў фізыкі. Стар. 298, 1932 г., ц. 2 руб. 90 к., пер. 65 к. *)

### ТЭХНІКА. МЭХАНІКА

БУШ Е. — Матэматыка фрэзэроўшчыка. Разьлікі пры рабоце на універсальным верстаце і дзялільных галоўках у простым і навуковым выкладзеньні, прыстасаваным для патрэб самаадукацыі. Стар. 288. 1932 г. ц. 2 руб. 35 к. пер. 25 к.

ГРЭЧАНІНАЎ В. (інж.). — Скалапеньне цыліндрычнае, акрэсьленае па лонгічным сячэньні. (Графічны і аналітычны метады яго рэзьбіцу). (НМК НКА БССР дапушчан у якасьці дапамоснікa для ВТНУ і тэхнікумаў даросна-будаўнічай спэцыяльнасьці). Стар. 60. 1932 г. ц. 1 руб. 60 к.

ГІОНТЭР ГАНС.—Электратэхніка ўсім. (З III-га рускага выд.). Стар. 378. 1932 г. ц. 3 руб. 60 к. пер. 90 к.

ЧАБАЧ-ЖУЧЭНКА Б. М. (праф.). — Даведнік маладога мэханіка. Дапаможнік для фабзавучу і для самаадукацыі. (ДНТВБ). Стар. 292. 1933 г., ц. 2 руб. 50 к. (у перапляце).

РУЦКІ А. — Асновы электратэхнікі. Стар. 256, 1931 г. ц. 1 руб. 75 к. *).

ТОМСОН Г. (праф.). - Атом. (НКЛП ДНТВБ — Сэктар падручніка і навуковай кнігі). Стар. 102. 1933 г. ц. 1 р. 20 к.

ФАДЗЕЕЎ Н. (інж.). — Элямэнтарная мэханіка з далучэньнем артыкулу «Супрацьўленьне матэрыялаў». Стар. 384 1930 г., ц. 2 р. 75 к. *)

### ПАЛІТЭКАНОМІЯ

МАРКС К. — Заработная плата, цана і прыбытак. Стар. 62. 1933 г., ц. 45 к.

МАРКС К. — Наёмная праца і капітал. (З уводзінамі Ф. Энгельса). Стар. 80. 1932 г., ц. 40 к.

МЭХЛІС Л. — Расьпыранае ўзнаўленьне сацыялістычных адносін. Стар. 28. 1933 г., ц. 10 к.

КАМБІНАВАНЬНЕ па ўзроўнях капіталізму і ў СССР. (Стэнаграма спрэчак ў ІПЭД). Стар. 132. 1932 г., ц. 1 р. 20 к.

КУШНЭР Д. (КНЫПАЎ). — Фэўдалізм. Стар. 120. 1931 г., ц. 40 к.

### РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

БУРДЗЯНСКІ І. — Асновы рацыяналізацыі вытворчасьці. Падручнік для камвузаў, рабочых універсытэтаў і сеткі прафтэхасьветы. (Выд. II, перапрацаванае і дапоўненае). Стар. 408. 1931 год, ц. 1 р. 70 к.

### МАРКСЫЗМ. ЛЕНІНІЗМ.

**ЛЕНІН У. І.** Збор твораў (12-томнік) і паасобныя творы, выданныя на бел. мове—гл. асобны сьпіс.

**МАРКС К. і ЭНГЕЛЬС Ф.** Маніфэст Камуністычнай партыі. (З апошняга рускага выданьня). Стар. 102. 1933 г. ц. 85 к. (у пер.).

ЭНГЕЛЬС Ф. — Роля працы ў апалавечаньні малпы. Стар. 36. 1933 г., цана 10 к.

МЭХЛІС Л. — Клясавая барацьба ў другой пяцігодцы. Стар. 48. 1932 г., цана 25 к. *)

БЭРМАН Я. — Дыктатура пролетарыяту ў другой пяцігодцы. Стар. 52. 1933 г., ц. 30 к.

ПАШУКАНІС Е. — Пралетарская дзяржава і пабудова бясклясавага грамадзтва. Стар. 42. 1933 г., ц. 25 к.

### ГІСТОРЫЯ ЎсеКП(б)

ПАПОЎ Н. — Нарыс гісторыі ЎсесаюзнайКамуністычнай Партыі (бальшавікоў), вып. I. (Выд. II, выкрэсьлены пасьля XV рускі выд.). Стар. 308. 1932 г., ц. 1 руб. 75 к.

### РУСКАЯ ГІСТОРЫЯ

ПАКРОЎСКІ М. — Расійская гісторыя ў самым кароткім нарысе. Ад самых старажытных часоў да канца XIX ст. Стар. 248. 1927 г., ц. 20 к.

ПАКРОЎСКІ М. — Руская гісторыя ў самым сьціслым нарысе, ч. I-II. Ад старажытнейшых часоў да канца XIX ст. Стар. 320. 1931 г., ц. 75 к., пер. 25 к.

ПАКРОЎСКІ М. — Руская гісторыя ў самым сьціслым нарысе, ч. III. XX ст., вып. I. (1896—1906 г. г.). Стар. 348. 1931 г., ц. 1 р., пер. 20 к.

### ГІСТОРЫЯ РЗВ. РУХУ ЗАХАДУ

МАРКС К. — Клясавая барацьба ў Францыі 1848—1850 г. г. Стар. 138. 1932 год, ц. 1 р. 25 к. (у каментаваньні аправе з цісьненьнем).

РУБАН С. — Ленін аб Парыскай камуне. Стар. 72. 1933 г., ц. 50 к.

ТОКІН І. — Ленін аб вялікай французкай рэвалюцыі. Стар. 80. 1933 г., ц. 55 к.

СЬЦЯКЛОЎ Ю. — Рэвалюцыя 1848 году ў Францыі. Стар. 68. 1931 г., ц. 50 к.

СЬЦЯПАНАЎ. — Парыжская камуна 1871 году. Стар. 168. 1931 г., ц. 1 р. 25 кап.

### ВАЕННАЯ СПРАВА

АРЦЭЗА В. — Ваенная справа. Падручнік па ваенных прадметах для тэхнікумаў, рабфакаў, школ ФЗС, прафшкол і старшага канцэнтру сямігодкі. Стар. 256. 1933 г., ц. 1 р. 75 к., пер. 25 к.

АРЦЭЗА В. і НОВІКАЎ А. — Ваенная падрыхтоўка. Падручнік для ВНУ па праграме вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўкі. Стар. 220. 1932 г., ц. 2 р. 50 к. *)

ВЕРЫЧАЎ. — Хімічная пагроза і абарона. Падручнік для ВНУ і тэхнікумаў. (Выд. II, перапрацаван. і дапоўн.). Стар. 200. 1933 г., ц. 2 р. 25 к.

ГРЭГОРЫО Ю. — Служба і сродкі сувязі. Навучовыя дапаможнікі для ВНУ, ваенізаваных курсаў сувязі і пастоў ПНАС Асоавіяхіму. (НМК НКА дапушчана ў якасьці навучальнага дапаможніка для вышэйшых навучальных устаноў, ваенізаваных курсаў сувязі і пастоў ПНАС). Стар. 216, 1932 г., ц. 2 руб. 70 кап.

### МЭДЫЦЫНА.

**(Для МэдВНУ і тэхнікумаў).**

МАГІЛЕЎЧЫК З. — Практыкум па эксперыментальнай (агульнай) пэдыятрыі. Стар. 204. 1931 г., ц. 2 руб. пер. 15.

МРАНГОВІЎС В. (праф.). —Скурныя і вэнэрычныя хваробы. Ч. I — Скурныя хваробы. Ч. II — Вэнэрычныя хваробы. (НМК НКА дапушчаны ў якасьці дапамоснікa для студэнтаў-медыкаў). Стар. 192. 1930 г., ц. 2 руб.

МЕЛКІХ С. (праф.) і МАЗЭЛЬ С. (д-р) — «Учение о самовнушении и опыт применения последнего в клинике лёгочного туберкулеза» (На рускай мове). Стар. 64. 1930 г., ц. 55 к.

РАЗАНАЎ Л. (праф.). — Кароткі курс фізыялёгіі чалавека для студэнтаў мэдычных ВНУ, прыродазнаўцаў і дактароў. Стар. 352. 1932 г., ц. 4 руб. 50 к.

РУБАШОЎ С. (праф.). — Кароткі падручнік клінічнай хірургіі. Стар. 432. 1932 г. ц. 6 руб. 80 к. пер. 80 к.

САКАЛОЎСКІ М. (праф.). — Кароткі падручнік па анэрэцыйнай хірургіі. (НМК НКА БССР дапушчаны ў якасьці падручніка для студэнтаў Мад. ВНУ і мэдтэхнікумаў). Стар. 376. 1932 г., ц. 4 рублі 10 к., пер. 50 к.

САРОХЦІН Г. (праф.). — Практыкум па рэфлексалёгіі. Мэтодыка ў заданьнях па фізыялёгіі цэнтральнай нэрвовай сыстэмы і спалучальна-рэфлекторнай дзеяльнасьці. Для студэнтаў мэдычных і пэдагагічных ВНУ. Стар. 104. 1931 г., цана 1 руб. 20 к.

ТИТОВ И. (праф.).—«Руководство для практических занятий по патологической гистологии». (На рускай мове). Стар. 96. 1925 г., ц. 50 к.

ЦЫПКІН Б. (д-р) — Вучэньне аб скрэфулезных хрыбетніка. (Скалёзы, Скіфозы, Лордозы). Дапаможнік для д-роў і выкладчыкаў фізкультуры. (Бел. Дз. Ін-т фізіятрыі, ортапэдыі і пэўрэлёгіі). Стар. 80. 1932 г., ц. 1 руб. 30 кап. (у перапляце).

ШАПІРА М. (дац.) і ЦЫПКІН Б. (д-р). Уводзіны ў практычную ортопэдыю. Падручнік для д-роў і студэнтаў. Стар. 160. 1931 г. ц., 1 руб. 30 к. пер. 15 к.

ГАЙВАРОЎСКІ А. і інш. Гігіена працы. Папулярныя нарысы. Стар. 80. 1930 год, цана 35 к.

ІРГЕР Ю. (дац.). — Пасьляапэрацыйная і пасьляродавая запрымка маці. Стар. 126. 1933 г., ц. 4 руб. 80 к., пер. 20 к.

КОРЧЫЦ А. (праф.). — Агульны нарыс. Стар. 52. 1931 г., ц. 60 к.

КОРЧЫЦ А. (праф.). — Антысэптыка і асэптыка. Стар. 76. 1931 г., ц. 65 к.

КОРЧЫЦ А. (праф.). — Мэтодыка клінічнага дасьледаваньня хірургічных хворых. Стар. 68. 1931 г., ц. 90 к.

РУБАШОЎ С. (праф).—Пераліваньне крыві. Стар. 24. 1932 г., ц. 50 к.

**Увага:** Назвы, якія адзначаны зорачкай*),—на Цэнтр. базе (гор. Менск) распраданы (ёсьць на мясцох).

## ДРУКУЮЦЦА і рыхтуюцца да друку („Рыхт").

### МАТЭМАТЫКА, ФІЗЫКА. ТЭХНІКА

БУРСТЫН А. — Курс дыфэрэнцыяльнай геомэтрыі. Арт. 15.

ЗАХАРЫН. — Канспэкт па фізыцы. (ДНТВБ). Арк. 10.

ПРЖЭВАЛЬСКІ Ч. — Пяцізначныя табліцы лёгарыфмаў лікаў і трыгонометрычных вялічынь. Арк. 12,5

РАШОЎСКІ К. — Трыгонометрыя. Арк. 4.

РЫБКІН А. — Задачы па геамэтрыі, ч. I. Плянімэтрыя. Арк. 7.

ШАПАШНІКАЎ і ВАЛЬЦАЎ. —Зборнік альгебраічных задач для сярэдняй школы, ч. I. Арк. 6.

СОКАЛАЎ І. — Фізыка для пэдтэхнікумаў. Арк. 2. (Рыхт.).

ГЕСЭ Г. — Тэхналёгія мэталяў. Арк. 25.

ЦІМАШЭНКА С. — Супрацьўленьне матар'ялаў (ДНТВБ). Арк. 22.

ІЕРУСАЛІМСКІ. — Тэхнічнае рысаваньне. Арк. 3,5.

### ПОЛІТЭКАНОМІЯ

ЛЕВОНЦЬЕЎ. — Пачатковы курс палітычнай эканомі. (Для СШП, рабфакаў і тэхнікумаў). Арк. 25 (Рыхт.).

МАРКС К. — Да крытыкі палітычнай эканомі. Арк. 15. (Рыхт.).

МАРКС К. — Наёмная праца і капітал. (Выд. II). Арк. 2,5. (Рыхт.).

ЭНГЕЛЬС Ф. — Канспэкт першага тому «Капіталу» К. Маркса, Арк. 4. (Рыхт.).

ЭНГЕЛЬС Ф. — Паходжаньне сям'і, прыватнай уласнасьці і дзяржавы. Арк. 10. (Рыхт.).

### ГІСТМАТ. ДЫЯМАТ.

МАРКС К. — Убозства філёзофіі. Арк. 15. (Рыхт.).

ЭНГЕЛЬС Ф. — Аб гістарычным матэрыялізьме. Арк. 1,5. (Рыхт.).

ЭНГЕЛЬС Ф. — Людзіг Фэйэрбах. Арк. 4. (Рыхт.).

МЦІН. — Гегель і тэорыя матэрыялістычнай дыялектыкі. Арк. 3.

МЦІН і РАЗУМОВІЧ. — Дыялектычны і гістарычны матэрыялізм, ч. II. Гістарычны матэрыялізм. (Для Камвузаў і ВНУ). Арк